Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

25 СТУДЗЕНЯ 2017 г. СЕРАДА № 16 (28380)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

Адраснае крэдытаванне жылля

СТАР. 3

Дзяржава для народа
Мясцовае Самакіраванне
Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

СТАР. 5-12

Нейрахірургія супраць эпілепсіі

СТАР. 13

ЦЫТАТА ДНЯ

Тамара КРАСОЎСКАЯ, старшыня Пастаяннай камісіі па працы і сацыяльных пытаннях Палаты прадстаўнікоў:

«Дэкрэт Прэзідэнта «Аб папярэджванні сацыяльнага ўтрыманства» паступіў у парламент. Прапанаваныя ў дакументе змяненні ідуць ад самога жыцця. Карэкціроўкі ўнесены з улікам правапрымяняльнай практыкі і прадыктаваны сучаснымі рэаліямі. Для таго каб зразумець прапанаванае, неабходна ў першую чаргу задаць сабе пытанне: дзе дзяржава бярэ грошы на фінансаванне ўсіх жыццёва важных для чалавека сфер і як я ў гэтым удзельнічаю? Той падыход, што фінансаваць дзяржаўныя выдаткі павінен кожны, — правільны».

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 25.01.2017 г.

Долар ЗША	1,9310	▼
Еўра	2,0746	▼
Рас. руб.	0,0326	▲
Укр. грыўня	0,0708	■

ISSN 1990 - 763X

У ГОСЦІ ДА СКАРЫНЫ

Фота Анатоля КПЕШЧУКА.

Таццянін дзень адзначае сёння і Таццяна Сапега. Больш за паўтара дзесяцігоддзя працуе яна ў Нацыянальнай бібліятэцы, дзе ўзначальвае сектар навукова-праектнай работы. Летась у бібліятэцы распачалася культурна-асветніцкая ініцыятыва для дзяцей і школьнікаў пад назвай «У госці да кніг». Яна прысвечана 500-гадоваму юбілею беларускага кнігадрукавання. Таццяна Сапега з'яўляецца адным з аўтараў гэтага надзвычай актуальнага праекта.

Сумесны праект „Звязды" Міністэрства па надзвычайных сітуацыях
ЖЫВІЦЕ Ў БЯСПЕЦЫ!

«ДНО МНОГІХ ВАДАЁМАЎ ПЕРАТВОРАНА Ў СМЕТНІК»

У чым сакрэты работы вадалазаў?

Гісторыя гэтая разыгралася неяк летнім вечарам у Мінску. Каля Лошыцкага парку ёсць участак, дзе захавалася старое русла Свіслачы і ўтвораныя там невялікія азёры. Ды і мясцовасць навокал глухаватая — усё зарасло лазой і дзікім вінаградам... Вадалазаў там сустрэў мясцовы ўчастковы міліцыянер. Пакуль яны ішлі да месца падзей і збіралі рыштунак, ён расказаў страшную гісторыю.

Кампанія зладзіла пікнік на беразе ракі. Нехта прыхапіў з сабой малога гадоў 10. Ён нібыта адышоў на метраў 50 убок і ўбачыў азярцо, у якім тануў чалавек. А на супрацьлеглым беразе стаяў нейкі змрочны тып. Апрануты ён быў у шэрую куртку з насунутым на галаву капюшонам. Хлопчык спужаўся і пабег да бацькоў. А незнаёмы — у іншы бок.

А цяпер уявіце сабе навакольную атмасферу. Гаснуць апошнія промні сонца. Імкліва цямнее. І вада здаецца чырвонай. Міліцыянер гаворыць: напэўна, гэта кроў... Першым з вадалазаў у гэтае азярцо зрабіў крок камандзір аддзялення. І тут жа схаваўся з галавой у вадзе.

СТАР. 4

■ Працяг тэмы

ЯКІМ БЫЦЬ ПАДМІКОЛЛЮ?

У Магілёве сышліся на тым, што ў парку не будзе фестывальнай пляцоўкі і гандлёвага цэнтра

Сёлета павінен быць зацверджаны генеральны план развіцця Магілёва да 2025 года. Яго грамадскае абмеркаванне закончылася яшчэ летась, але ўсё яшчэ існуюць спрэчныя пытанні па Падміколлі — адной з гістарычных зон горада, дзе цяпер ствараецца гарадскі парк. Рэспубліканскі архітэктурна-горадабудаўнічы Савет пры Міністэрстве архітэктуры і будаўніцтва параіў Магілёўскаму гарвыканкаму правесці круглы стол для выпрацоўкі канкрэтных рашэнняў па развіцці названай тэрыторыі. Удзел у ім прынялі дэпутаты гарсавета, прадстаўнікі Магілёўскага аблвыканкама, Свята-Мікольскага жаночага манастыра і грамадскасці.

СТАР. 4

Фота Алеся САБАЛЕЎСКАГА.

СУМЛЕННА І ПРЫСТОЙНА ГАНДЛЯВАЦЬ ДРАЎНІНАЙ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка патрабуе забяспечыць перапрацоўку ўсёй драўніны ўнутры Беларусі. Аб гэтым Прэзідэнт заявіў, заслухаўшы даклад па пытаннях рэалізацыі на экспарт круглых лесаматэрыялаў, перадае карэспандэнт БЕЛТА.

Паводле слоў Аляксандра Лукашэнкі, урад выступіў з прапановай прадоўжыць дзеянне экспартных квот на лес. «Незразумела, чаму да гэтага часу вы ўносіце на разгляд Прэзідэнта гэтыя пытанні, — адзначыў кіраўнік дзяржавы. — Размова ідзе аб выкарыстанні драўняных рэсурсаў нашай краіны. Зусім нядаўна мы вельмі сур'ёзна гаварылі аб зямлі, аб адвядзенні ўчасткаў пад будаўніцтва, аб каштоўнасці зямельных рэсурсаў. Сёння мы гаворым аб лясных рэсурсах. Гэта другая вялікая каштоўнасць, якую не мы з вамі стварылі — ад Госпада нам дасталася».

Прэзідэнт нагадаў, што ў 2015 годзе быў падпісаны ўказ, згодна з якім вывозіць за межы Беларусі неапрацаваную драўніну без згоды кіраўніка дзяржавы было забаронена. Адпаведны экспарт дазваляўся толькі ў выключных выпадках. «Часам узнікаюць форс-мажорныя абставіны. Калі ў 2015—2016 гадах ураган паваліў дрэвы на дзясятках тысяч гектараў лясных угоддзяў, вы да мяне звярталіся тройчы, і я даваў такі дазвол на рэалізацыю круглай драўніны на экспарт», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

Ён падкрэсліў, што цяпер ніякай надзвычайнай сітуацыі ў гэтым плане няма, а паваленыя ўраганам участкі лесу параўнальна невялікія і даступныя для лесанарыхтоўчай тэхнікі.

«На працягу многіх гадоў мы развівалі дрэваапрацоўчую галіну і інвесціравалі ў яе. Дрэваапрацоўка — тая галіна, сыравіны для якой у Беларусі з лішкам, — сказаў Аляксандр Лукашэнка. — У нас дастаткова магутнасцяў, каб самім вырабляць з гэтай сыравіны гатовую прадукцыю і з высокай дабаўленай вартасцю».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што паваленыя ўраганам лес можна як мінімум пусціць на неабразныя дошкі, якія асабліва патрэбныя ў вёсцы, або вырабіць іншую запатрабаваную прадукцыю. «І раптам урад выступіў з прапановай прадоўжыць дзеянне экспартных квот на лес. Гэта значыць прадоўжыць дазвол на вываз неапрацаванага лесу», — канстатаваў Прэзідэнт.

У сувязі з гэтым ён пацікавіўся, якія аб'ёмы нерэалізаванай драўнянай сыравіны і чаму ставіцца пытанне аб продажы яе за мяжу, калі асобныя дрэваапрацоўчыя прадпрыемствы не загружаны. Кіраўніка дзяржавы таксама цікавіла, колькі набыта тэхнікі айчыннай вытворчасці для нарыхтоўкі драўніны і выдзелена грошай для будаўніцтва лясных дарог, каб вывозіць гэту драўніну і апрацоўваць.

Аляксандр Лукашэнка запатрабаваў выкараніць магчымасці для вывазу за мяжу драўніны па шэрых схемах. «Паўстае яшчэ адно пытанне, якое ўздымае перад Прэзідэнтам курыруючы лес старшыня КДК: калі будзе пастаўлена жалезная заслона шэрым схемам, па якіх вывозіцца лес з краіны. Гэта я ў вас павінен запытаць, чаму па шэрых схемах да гэтага часу ў краіне нехта прадаваў учора або прадае сёння, можа, і заўтра неабразны лес», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

«Вы мяне інфармавалі, што камерсанты купляюць на ўнутраным рынку кубаметр хвойных за 30 еўра, надпілоўваюць бярвёны з тарцоў, апрацоўваюць непасрэдна ў лесе і пад выглядам нейкіх слупоў, калоў перапрадаюць фактычна неапрацаваную сыравіну за мяжу», — адзначыў Прэзідэнт. Кіраўнік дзяржавы папярэдзіў аб адказнасці тых, хто дапускае такія факты.

Як дакладваюць Прэзідэнту, дзякуючы такім маніпуляцыям у кішэнях некаторых дзялкоў аселі мільёны долараў. «У каго ў кішэнях? Чаму яны яшчэ ў іх у кішэнях, гэтыя долары, а не ў бюджэце краіны ў трайным або дзесяцікратным памеры?» — задаў пытанне Аляксандр Лукашэнка.

«Калі такія выпадкі ёсць, я хацеў бы, каб мы сёння на гэту тэму скончылі размову. Усё, што павінна паступіць у кішэню дзяржавы, павінна паступіць. Усё павінна быць сумленна і прыстойна», — падкрэсліў беларускі лідар.

Як расказаў журналістам пасля нарады міністр лясной гаспадаркі Міхаіл Амельяновіч, урадам прыняты ўжо меры, каб піловачнік не ішоў на экспарт пад выглядам калоў і слупоў. «Прынята пастанова аб ліцэнзаванні гэтых відаў прадукцыі», — сказаў ён.

Міхаіл Амельяновіч растлумачыў, што адпаведная пастанова прынята ўжо у снежні 2016 года і ўступіць у сілу з 1 лютага бягучага года.

Паводле слоў Міхаіла Амельяновіча, Прэзідэнт дазволіў у 2017 годзе экспартаваць 1,8 млн куб.м неапрацаванай драўніны. «Ён папярэдзіў, што гэта апошні раз, і каб да яго больш нават не звярталіся з такімі просьбамі. Увесь рэсурс павінен перапрацоўвацца на айчынных прадпрыемствах», — сказаў кіраўнік ведамства. Ён растлумачыў, што яшчэ не на ўсіх прадпрыемствах дрэваапрацоўчай прамысловасці завяршылася стадыя мадэрнізацыі, а таму ў бліжэйшы час патрэбнасць у драўніне на ўнутраным рынку будзе толькі ўзрастаць. Адным з найбольш буйных спажыўцоў гэтай сыравіны стане Светлагорскі цэлюлозна-кардонны камбінат з улікам стварэння новай вытворчасці сульфатнай беленай цэлюлозы.

Не ва ўрон службе

Ад аптымізацыі ў органах унутраных спраў нідзе не дзецца, але бяздумнага скарачэння быць не павінна

Аб гэтым Аляксандр Лукашэнка заявіў учора падчас рабочай сустрэчы з міністрам унутраных спраў Ігарам Шуневічам, паведаміў карэспандэнт БЕЛТА.

Кіраўніку дзяржавы было даложана аб выніках дзейнасці органаў унутраных спраў у 2016 годзе, запланаваных арганізацыйных і практычных мерапрыемствах, накіраваных на павышэнне эфектыўнасці дзейнасці МУС. Асобнай тэмай даклада стала аптымізацыя структуры міністэрства.

«Мы гэтага не пазбегнем. Вы пастаянна мне дакладваеце, што крымінагенная сітуацыя паляпшаецца, значыць, нам паступова трэба ісці да скарачэння, але не да бяздумнага, а да аптымізацыі структур», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што сэканомленыя за кошт гэтага сродкі застануцца на балансе ведамства. «Калі ласка, дадавайце аклады, купляйце службовую маёмасць, узбраенне і гэтак далей. Усё, што вы скароціце, застанецца ў вас. Плюс я яшчэ ў два разы павялічу гэтую лічбу і дадам. Гэта значыць, скарацілі на Br10 млн, атрымаеце 20 мільёнаў — 10 мільёнаў скарочаных і 10 — дадаткова з бюджэту, — сказаў кіраўнік дзяржавы. — Таму вы павінны быць зацікаўлены ў гэтым, але не ва ўрон службе. Не павінна быць аптымізацыі дзеля пустога скарачэння. Тым больш нельга крыўдзіць прыстойных людзей у міліцыі. Калі яны заслугоўваюць і далей працягваць сваю службу, калі яны запатрабаваныя, значыць, іх трэба захаваць. Хто не хоча, не можа, хто дрэнна нясе службу — ад такіх трэба пазбаўляцца. Таму павінна быць разумная аптымізацыя».

* * *

Прэзідэнт падчас рабочай сустрэчы з міністрам унутраных спраў, старшынёй назіральнага савета ХК «Дынама-Мінск» Ігарам Шуневічам раскрытыкаваў гульню беларускіх хакеістаў у КХЛ.

«Так, як вы, хакеісты «Дынама-Мінск», сябе паводзілі на пляцоўцы, гуляючы з рыжскім «Дынама», гэта ні ў адны вароты не лезе», — заявіў Аляксандр Лукашэнка.

Прэзідэнт падкрэсліў, што рыжская каманда саступае мінскім аднаклубнікам па многіх паказчыках, аднак у гульні аказалася значна мацнейшая.

«Калі б хакеісты ў Рызе атрымлівалі такія зарплаты, як нашы, у іх на парадак быў бы вышэйшы клуб. А вы як быццам не збіраецеся ў плэй-оф гуляць. Не забывайце, што 15 тысяч балельшчыкаў сядзяць на стадыёне і мільёны вас глядзяць, у тым ліку і я. Сорамна было глядзець. Каманда гуляе няроўна, вы прайграяце тады, калі нельга прайграваць. Тое, што вы зараз страціце, потым крывёю трэба будзе здабываць, каб выйсці ў плэй-оф і там годна выступіць. Вы ж не для мяне гуляеце, а для людзей, для народа», — заўважыў кіраўнік дзяржавы.

■ Ва ўрадзе

НЕ БУДУЧЫНЯ, А РЭАЛЬНАСЦЬ

Прэм'ер-міністр Андрэй Кабякоў падчас чарговага пасяджэння прэзідыума Савета Міністраў заклікаў выкарыстоўваць для развіцця электроннага ўрада ўжо створаную інфраструктуру. Па словах прэм'ера, лічбавая трансфармацыя — адзін з найважнейшых складнікаў у росце канкурэнтаздольнасці эканомікі нашай краіны.

«Прамежкавыя вынікі нашай работы ў сферы інфарматызацыі досыць высока ацэненыя сусветнай супольнасцю, — адзначыў кіраўнік урада. — Так, у рэйтынгу Міжнароднага саюза электрасувязі па развіцці інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, наша краіна займае досыць высокае 31-е месца сярод 175 краін, палепшыўшы сваю пазіцыю за год на 5 пунктаў. Асобна варта падкрэсліць, што сярод краін СНД мы першыя. Аднак, па ацэнцы ААН, па ўзроўні гатоўнасці электроннага ўрада Беларусь знаходзіцца на 49 месцы ў рэйтынгу са 193 краін, падняўшыся за два гады на 6 пазіцый і пры гэтым саступае і Расіі, і Казахстану. Гэта паказвае недастатковы ўзровень выкарыстання створанай інфраструктуры».

Па словах прэм'ера, гэта значыць, што механізм функцыянавання і прымянення электроннага ўрада яшчэ далёкі ад ідэалу. «Так, напрыклад, мы дагэтуль недастаткова выкарыстоўваем на практыцы электронны дакументазварот. Аб'ём карэспандэнцыі, што перадаецца ў электронным выглядзе, у большасці дзяржаўных органаў не дасягае і 50% ад агульнага аб'ёму. У рэгіёнах колькасць падключаных арганізацый складае менш за 30%, пры гэтым Мінсувязі практычна не прымяняе ніякіх кардынальных мер, — падкрэсліў Андрэй Кабякоў. — Электронныя паслугі ідэнтыфікацыі грамадзян у нас усё яшчэ ўспрымаюцца як планы на найбліжэйшую будучыню. Якіх-небудзь прарыўных зрухаў, вынікаў тут няма».

На пасяджэнні таксама ішла гаворка аб асваенні сродкаў, выдзеленых на мерапрыемствы па пераўтварэнні інфармацыі ў лічбавую форму. Для гэтых мэт быў створаны асобны пазабюджэтны фонд, аднак другі год запар назіраецца няпоўнае асваенне яго сродкаў. Так, у 2015 годзе асваенне склала менш за 50%, у 2016 годзе — 85%. «Ва ўмовах, калі на рахунку кожная капейка рэспубліканскага бюджэту, такія вынікі асваення сродкаў фонду недапушчальныя. Калі ў далейшым Мінсувязі і іншыя атрымальнікі сродкаў фонду не змогуць своечасова іх асвойваць, то я вымушаны буду падтрымаць прапановы аб пераліку неасвоеных па выніках года грошай у рэспубліканскі бюджэт», — дадаў прэм'ер-міністр.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

Юбілею насустрач

Распараджэннем Прэм'ер-міністра ад 24 студзеня 2017 года №27р створаны арганізацыйны камітэт па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання. Адпаведная інфармацыя размешчана на афіцыйным сайце беларускага ўрада, паведамляе БЕЛТА.

Арганізацыйны камітэт узначалілі міністр інфармацыі Лілія Ананіч і міністр культуры Барыс Святлоў. У яго склад таксама ўвайшлі прадстаўнікі міністэрства замежных спраў, міністэрства адукацыі, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.

Паводле распараджэння, аргкамітэту неабходна зацвердзіць план мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і правядзенні святкавання 500-годдзя беларускага кнігадрукавання і забяспечыць яго рэалізацыю.

Рэспубліканскім органам дзяржаўнага кіравання, аблвыканкамам, Мінскаму гарвыканкаму даручана аказваць садзейнічанне аргкамітэту ў падрыхтоўцы і правядзенні названых мерапрыемстваў.

Фінансаванне арганізацыі і правядзення мерапрыемстваў, прысвечаных 500-годдзю беларускага кнігадрукавання, будзе ажыццяўляцца ў межах сродкаў, прадугледжаных рэспубліканскім і мясцовымі бюджэтамі на правядзенне цэнтралізаваных мерапрыемстваў, а таксама за кошт іншых крыніц.

■ Геапалітыка

Новыя выклікі і надзеі

Сусветны эканамічны форум у Давосе, які прайшоў на мінулым тыдні, выявіў нечаканыя змены ў сусветнай эканоміцы. У той час як у ЗША з перамогай на прэзідэнцкіх выбарах Дональда Трампа актыўна абмяркоўваюцца пратэкцыянісцкія меры, закліканыя абараніць амерыканскі рынак ад наступстваў занадта паспяховай дзейнасці Кітая ў галіне экспартных паставак, лідар КНР Сі Цзіньпін заклікаў абараняць свабоду гандлю і шанаваць глабалізацыю. Трэба адзначыць, што кітайцы заўсёды ў апошнія дзесяцігоддзі выказваліся ў абарону глабалізацыі, бачачы ў ёй пазітыўную сілу для Кітая. Улічваючы магутны эканамічны рост кітайскай эканомікі, гэта зразумела. Акрамя таго, умовы ўдзелу Кітая ў сусветнай эканоміцы палепшыліся, калі глабалізацыя не будзе павернутая назад. 11 снежня 2016 года споўнілася 15 гадоў з моманту ўступлення Кітая ў СГА, а паводле статута арганізацыі гэта азначае аўтаматычнае прызнанне эканомікі краіны рыначнай (першыя пятнаццаць гадоў у СГА Кітай прызнавалі эканомікай з нярыначным статусам). Акрамя ўсяго, гэта цягне за сабой адмену артыкула, які дазваляў іншым краінам уводзіць спецыяльныя антыдэмпінгавыя тарыфы ў дачыненні да кітайскіх тавараў.

Уступленне на пасаду прэзідэнта ЗША Дональда Трампа суправаджалася магутнымі пратэстамі. Чамусьці пратэстоўцы білі вітрыны магазінаў і канфліктавалі з паліцыяй. Амерыканскія СМІ сканцэнтравалі асноўную ўвагу на пратэстах, паспрабаваўшы зменшыць значэнне інаўгурацыі прэзідэнта. За гэта яны атрымалі гнеўны адказ з боку кіраўніка апарату Белага дома Райнса Прыбаса, які абвінаваціў амерыканскія СМІ ў жаданні пазбавіць легітымнасці новага прэзідэнта ЗША. Пра падобныя рэчы казаў і прэс-сакратар Трампа Шон Спайсер — ён адзначыў, што амерыканскія СМІ распаўсюджвалі лжывую інфармацыю аб колькасці людзей, якія прысутнічалі на цырымоніі ўступлення на пасаду новага кіраўніка дзяржавы, спрабуючы яе зменшыць. Сам жа новы прэзідэнт пачаў з таго, што і абяцаў — прыступіў да адмены рэформы аховы здароўя, праведзенай яго папярэднікам Баракам Абамам.

У гэты ж самы час па-русафобску настроеныя члены парламента ЗША не пакладаючы рук працуюць над тым, каб пазбавіць новага амерыканскага прэзідэнта магчымасці палепшыць адносіны з Расіяй. У прыватнасці, яны плануюць унесці ў Кангрэс законапраект, які не дазволіць прэзідэнту зняць санкцыі з Расіі, калі такое жаданне ў яго паўстане. Хоць ініцыятыва агучана прадстаўнікамі дэмакратычнай меншасці, няма сумнення, што яе падтрымаюць і некаторыя з членаў Рэспубліканскай партыі, якая дамінуе ў Кангрэсе.

Кітайскія СМІ адрапартавалі аб тым, што **страхі аб неўзабаве маючым адбыцца скарачэнні кітайскай нацыі неабгрунтаваныя**. На хвалі апасенняў, што кітайскае насельніцтва імкліва старэе і неўзабаве будзе занадта мала працоўных рук сярод моладзі і занадта шмат пенсіянераў, якіх трэба забяспечваць, кітайскія ўлады ў 2015 годзе адмянілі забарону мець другое дзіця ў сям'і. У выніку ў 2016-м у КНР з'явілася на свет 17,6 мільёна дзяцей, у той час як у папярэдніх 2011—2015 гадах — нараджальнасць была на 1,4 мільёна чалавек штогод меншай. Калі цяпер у Кітаі каля мільярда трохсот сямідзесяці мільёнаў жыхароў, то 2021 год КНР можа сустрэць з насельніцтвам у мільярд чатырыста дваццаць мільёнаў чалавек. Гэта дазволіць вытрымліваць канкурэнцыю з вельмі маладым насельніцтвам Індыі, дзе вялікая пенсійная нагрузка на бюджэт яшчэ справа аддаленая будучыні.

На фоне неабходнасці канцэнтраваць уладныя паўнамоцтвы для барацьбы з шматлікімі выклікамі, якія абрынуліся на Турцыю (гэта і спроба ваеннага перавароту, якая адбылася ў ліпені мінулага года і выявіла сур'ёзныя супярэчнасці ў грамадстве, і хваля тэрарызму, якая дэстабілізавала мірнае жыццё грамадзян, і вайна, якая працягваецца ў суседняй Сірыі і ў выніку якой у Турцыю з'ехаліся мільёны бежанцаў), **парламент Турцыі 21 студзеня прыняў пакет** змяненняў у канстытуцыю краіны. З гэтага часу форма праўлення змяняецца з парламенцкай на прэзідэнцкую, скасоўваецца і пасада кіраўніка ўрада. Прэзідэнт становіцца кіраўніком дзяржаўнай сістэмы, атрымлівае паўнамоцтвы па прызначэнні кандыдатаў на вышэйшыя дзяржаўныя пасады.

На мінулым тыдні адбыліся вельмі прадуктыўныя **візіты кіраўніка беларускай дзяржавы ў Егіпет і Судан**. Асабліва плённа беларуская дэлегацыя папрацавала ў Егіпце, з якім адносіны Беларусі можна назваць найбольш развітымі на ўсім Афрыканскім кантыненце. Плануецца пашырыць ужо даўно пачатае супрацоўніцтва ў галіне вытворчасці беларускай тэхнікі на тэрыторыі гэтай краіны як за кошт нарошчвання выпускаемай прадукцыі, так і за кошт яе разнастайнасці. Перспектывы развіцця эканамічнага супрацоўніцтва ёсць, але галоўнае залежыць ад гатоўнасці прымаючага боку падтрымаць беларускія ініцыятывы.

Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук ■

■ Дыпламатыя ў дзеянні

ВОПЫТ ПАДНЯБЕСНАЙ

«Звязда» прэзентавала кнігу пра беларуска-кітайскія адносіны

У 1990-я мала хто думаў, што беларуска-кітайскія адносіны могуць стаць настолькі перспектыўнымі. Але сёння мала з якой краінай у нас падтрымліваюцца кантакты настолькі шчырыя. «Вялікі камень» і ініцыятыва эканамічнага пояса Шаўковага шляху, сувязі ў адукацыі, СМІ, сельскай гаспадарцы, навуцы... А ў панядзелак вечарам у Доме сяброўства ў сталіцы адбылася прэзентацыя кнігі прафесара Анатоля ТОЗІКА, які ў свой час быў Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом нашай краіны ў Кітаі, а сёння ўзначальвае таварыства сяброўства «Беларусь — Кітай». Выданне называецца «Беларуска-кітайскія адносіны ва ўспамінах беларускіх паслоў» і прымеркавана да 25-годдзя ўстанаўлення беларуска-кітайскіх адносін.



Фота Кастуся ДРОБАВА.

Анатоль Тозік у размове з журналістамі расказаў, што «кітайскі цуд», магчымасць паўтору такога вопыту ў беларускіх рэаліях — адна з мэт кнігі.

— Лічу, што такі вопыт для нас выключна карысны і прымальны, таму што ў нас агульныя падыходы да ўнутранай, знешняй палітыкі. Мы ў гэтым вельмі блізкія.

На прэзентацыю кнігі прыйшло шмат высокіх гасцей. Гэта і **намеснік Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Баляслаў ПІРШТУК, і міністр інфармацыі Лілія АНАНІЧ, і Надзвычайны і Паўнамоцны Пасол Кітая ў нашай краіне Цуй Цымін...** Ганаровымі гасцямі мерапрыемства сталі беларускія дыпламаты, якія ў свой час працавалі ў Кітаі. Менавіта на аснове іх успамінаў і была напісана гэта кніга.

Баляслаў Пірштук прызнаўся, што яго асабіста шмат што звязвае з Паднябеснай, раней па рабоце яму не раз даводзілася там бываць. Лілія Ананіч звярнула ўвагу на важнасць развіцця ўзаемадзеяння паміж Беларуссю і КНР у розных сферах, у тым ліку па лініі кнігавыдавецтва.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■

Дармаед ці не дармаед?

Разабрацца ў гэтым пытанні дапамогуць камісіі, якія будуць створаны ў раёнах Гомельскай вобласці

Больш як 5,5 тысячы фізічных асоб — жыхароў Гомельшчыны ўжо вызвалены ад неабходнасці выплаты так званага падатку за ўтрыманства. У асноўным гэта людзі, якія ў 2015 годзе працавалі за мяжой. Дарэчы, «лісты шчасця» ў вобласці ўручылі 92 тысячам чалавек.

Намеснік начальніка абласной падатковай інспекцыі Дзмітрый ДАЙНЭКА расказаў на брыфінгу, што 35 чалавек вызвалілі ад выплаты па рашэнні мясцовых органаў улады. Нагадаем, што ўжо сёлета ў Дэкрэт №3 «Аб папярэджванні сацыяльнага ўтрыманства» былі ўнесены змяненні. У тым ліку дапоўнены пералік асоб, якім не трэба выплачваць збор.

Тыя ж, хто не аспрэчвае абавязак выплаты збору, пачалі ўносіць плацяжы. Штодня з дзяржавай за сацыяльныя выгоды разлічваюцца 230—250 чалавек. Унесці аплату неабходна да 20 лютага.

Тым часам старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Дворнік на нарадзе ў аблвыканкаме даручыў забяспечыць калегіяльнасць у прыняцці рашэнняў па пункце 15-1 Дэкрэта №3, які прадугледжвае назначэнне льгот па выплаце збору на фінансаванне дзяржаўных выдаткаў людзям, якія апынуліся ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Кіраўнік вобласці даў распараджэнне аператыўна стварыць пры ўсіх райвыканкамах камісіі, у якія будуць уключаны спецыялісты розных сфер дзейнасці.

Да таго ж з 24 студзеня да 1 сакавіка падатковыя інспекцыі ва ўсіх раёнах Гомельшчыны будуць штодня з 10.00 да 12.00 праводзіць прамыя тэлефонныя лініі па пытаннях рэалізацыі Дэкрэта №3 «Аб папярэджванні сацыяльнага ўтрыманства». Нумар прэс-цэнтра інспекцыі МНС па Гомельскай вобласці — 8 (0232) 79 88 28.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

■ Жыллё

ІЛЬГОТНАЕ КРЭДЫТАВАННЕ ЗАМЕНЯЦЬ АДРАСНАЙ ДЗЯРЖПАДТРЫМКАЙ

Аб гэтым гаворыцца ў пастанове Савета Міністраў ад 12 студзеня 2017 года №18, якая зацвярджае комплекс мер па рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады.

У прыватнасці, у дакуменце гаворыцца, што для грамадзян, якія стаяць на ўліку для паляпшэння жыллёвых умоў, будзе прадугледжана замена льготнага крэдытавання жыллёвага будаўніцтва крэдытаваннем на рынкавых умовах з адраснай дзяржаўнай падтрымкай такіх асоб за кошт бюджэтных сродкаў. Пастанова ўдакладняе, што пераход да новага прынцыпу фінансавання жыллёвага будаўніцтва для «чаргавікоў» будзе рэалізаваны на працягу гэтага года. Дакладны механізм такой адраснай дзяржпадтрымкі сёлета павінны распрацаваць спецыялісты Мінбудархітэктуры, Мінэканомікі, Мінфіна, Нацыянальнага банка, аблвыканкамаў і Мінскага гарвыканкама.

Таксама дакумент прадугледжвае стварэнне агенцтва па іпатэчным жыллёвым крэдытаванні для развіцця інфраструктуры рынку іпатэчнага жыллёвага крэдытавання, забеспячэння яго ўстойлівасці, ліквіднасці і павышэння даступнасці жылля для насельніцтва. Непасрэдна эксперты будаўнічай галіны павінны будуць на працягу 2017—2018 гадоў распрацаваць механізм фінансавання будаўніцтва інжынернай і транспартнай інфраструктуры ў раёнах жылой забудовы на ўмовах дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Акрамя таго, ужо сёлета грошы грамадзян на набыццё і будаўніцтва жылля плануецца вызваліць ад дэкларавання і падатковых прэтэнзій.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

НАЛЕТА КАМУНАЛКУ БУДЗЕМ АПЛАЧВАЦЬ ЦАЛКАМ

Не менш за 75% ад рэальнага кошту аказання паслуг сёлета і 100% у 2018-м — такі рост лічбаў у жыллёва-камунальнай гаспадарцы чакае насельніцтва. Наступныя два гады тарыфы будуць падтрымлівацца на ўзроўні, які забяспечыць поўную кампенсацыю імі затрат на ЖКГ-абслугоўванне. Пакрыццё расходаў у транспартным сэрвісе налета плануецца павысіць для грамадзян да 70% і на працягу 2019—2020 гадоў прытрымлівацца дасягнутых лічбаў.

Усе павышэнні прадугледжаны комплексам мер па рэалізацыі Праграмы сацыяльна-эканамічнага развіцця Беларусі на 2016—2020 гады, зацверджаным Саветам Міністраў у студзені бягучага года. Пры гэтым павелічэнне кошту ў галіне ЖКГ будзе праводзіцца з улікам зніжэння затрат на аказанне паслуг і атрымання грамадзянамі безнаяўных жыллёвых субсідый.

Тарыфныя пераўтварэнні ў галінах транспарту і ЖКГ патрабуе правесці і Міжнародны валютны фонд, што з'яўляецца адной з умоў атрымання нашай рэспублікай крэдыту ў $3 млрд. Пры гэтым запланавана прыняць сістэмныя меры па аптымізацыі расходаў на аказанне жыллёва-камунальных і транспартных паслуг.

Нагадаем, што з 1 студзеня цеплаэнергія ў краіне падаражэла на 17% і склала крыху больш за 15,5 рубля за 1 Гкал. На столькі ж працэнтаў у ацяпляльны перыяд вырас і кошт прыроднага газу. Цяпер яго кубічны метр каштуе 0,0908 рубля, а летам кошт павялічыцца да 0,2842 рубля. Апошняя лічба дзейнічае і зімой для грамадзян, што не маюць прыбораў уліку расходу газу.

За 2017—2020 гады мяркуецца таксама дасягнуць 100% кампенсацыі насельніцтвам і тарыфаў на паслугі электрасувязі і пошты.

У сваю чаргу, скарачэнне перакрыжаванага субсідзіравання з 2019 года павінна прывесці да зніжэння тарыфаў для рэальнага сектара эканомікі.

Ірына СІДАРОК. *sidarok@zviazda.by*

■

МЯНЯЕЦЦА ПАМЕР ДЗІЦЯЧЫХ ВЫПЛАТ

З 1 лютага ў Беларусі павялічыцца памер выплат па доглядзе за дзецьмі ва ўзросце да трох гадоў. Новы памер дапамог будзе дзейнічаць па 30 красавіка гэтага года.

Для разліку памеру гэтых дапамог будзе прымяняцца паказчык сярэднямесячнай заработнай платы за чацвёрты квартал 2016 года, які быў роўны 746,80 руб.

Такім чынам, з лютага памер штомесячнай дапамогі па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў складзе на першае дзіця 261,38 руб. (або 35% сярэднямесячнай заработнай платы работнікаў па краіне), на другое і наступных дзяцей — 298,72 руб. (ці 40% сярэднямесячнай заработнай платы), на дзіця-інваліда ва ўзросце да трох гадоў — 336,06 руб. (45% сярэднямесячнай заработнай платы незалежна ад чарговасці нараджэння гэтага дзіцяці ў сям'і).

Сем'ям, якія пражываюць на тэрыторыі радыеактыўнага забруджвання ў зоне наступнага адсялення або з правам на адсяленне, дапамога па доглядзе за дзіцем ва ўзросце да трох гадоў прызначаецца і выплачваецца ў памеры 150% да ўстаноўленай законам.

З лютага зменіцца і памер аднаразовых выплат у сувязі з нараджэннем дзіцяці. Гэтыя выплаты залежаць ад памеру бюджэту пражытковага мінімуму (БПМ). Колькі будуць плаціць у сувязі з нараджэннем дзіцяці, стане вядома пасля прыняцця пастановы Мінпрацы і сацабароны аб устанаўленні новага памеру БПМ на перыяд з 1 лютага па 30 красавіка 2017 года.

Святлана БУСЬКО. *busko@zviazda.by*

■ Добрая навіна

Матывацыя для маладых педагогаў

Маладым спецыялістам з катэгорыі педагагічных работнікаў, якія ўжо адпрацавалі па размеркаванні два гады, але працягваюць працаваць у гэтай жа ўстанове адукацыі, яшчэ на год падаўжаецца выплата даплаты ў памеры адной тарыфнай стаўкі першага разраду. Гэта прадугледжана пастановай Савета Міністраў ад 19 студзеня 2017 года №48.

Згодна з рашэннем урада, маладыя настаўнікі, якія працуюць ва ўстанове адукацыі трэці год, будуць атрымліваць даплату ў памеры да адной тарыфнай стаўкі першага разраду, якая зараз складае 31 рубель. Даплаты будуць выплачвацца маладым спецыялістам па асноўным месцы працы прапарцыянальна адпрацаванаму часу. Пастанова ўступае ў сілу з 1 студзеня 2017 года.

У Міністэрстве адукацыі спадзяюцца, што гэта мера дазволіць не дапусціць зніжэння заробкаў у маладых спецыялістаў і іх адтоку з установ адукацыі. Захаванне даплаты яшчэ на адзін год дасць магчымасць маладым педагогам прайсці атэстацыю для атрымання другой кваліфікацыйнай катэгорыі. Інструкцыяй аб атэстацыі педагагічных работнікаў устаноўлена, што прэтэндаваць на прысваенне другой кваліфікацыйнай катэгорыі могуць педагагічныя работнікі, якія маюць стаж працы на пасадзе, па якой атэстуюцца, два гады. Надбаўка за другую кваліфікацыйную катэгорыю складае 30% ад тарыфнага акладу (стаўкі).

Дарэчы, у Беларускім дзяржаўным педагагічным універсітэце праводзілі маніторынг і ўстанавілі, што ад 65 да 80% яго выпускнікоў, адпрацаваўшы два гады пасля заканчэння ўніверсітэта, застаюцца ў той жа школе. У некаторых раёнах гэты паказчык увогуле дасягае 90—100 працэнтаў. Цяпер маладыя педагогі будуць яшчэ больш матываваныя да таго, каб застацца на першым працоўным месцы.

Надзея НІКАЛАЕВА. *nikalaeva@zviazda.by*

■

■ Пытальнік

ЧАКАЙЦЕ, ГЛЕДАЧЫ, ПЕРАДАЧА ВЕРНЕЦЦА Ў ЭФІР

Вітаю, дарагая рэдакцыя газеты «Звязда»! Піша вам пенсіянерка. Шмат гадоў я глядзела тэлеперадачу «Чакай мяне. Беларусь», але з восені яна перастала выходзіць у эфір. Я хачу даведацца, чаму? Можа быць, яна з пачатку новага года зноў будзе выходзіць?

Рэгіна Данілаўна ЛІПНІЦКАЯ, вёска Возера Уздзенскага раёна.

Перадача «Чакай мяне. Беларусь» — мая любімая. Ніколі яе не прапускаў, глядзеў кожны выпуск, бо заўсёды краналі гісторыі герояў. Вельмі шкада, што яна знікла з тэлевізійнай праграмы. Ці плануецца яе вяртанне на экраны?

Тадэвуш Антонавіч САДОЎСКІ, вёска Далгінава Вілейскага раёна.

Як расказала на наш запыт прэс-сакратар тэлеканала АНТ Юлія Дубоўская, цяпер усе гісторыі, звязаныя з пошукам суайчыннікаў на тэрыторыі нашай краіны, выходзяць у аднайменнай з перадачай рубрыцы ў праграме «Наша раніца». У такім фармаце яна будзе трансліравацца яшчэ некалькі месяцаў, пасля чаго, сапраўды, плануецца вярнуць у эфір саму перадачу «Чакай мяне. Беларусь». Чаму яна на нейкі час знікла з экранаў? Гэта звязана з тэхнічнымі прычынамі. Як вядома, у Расіі перадача запісваецца з усіх краін, мы бралі толькі частку з расійскімі вядучымі. Была праблема з гэтым самым запісам са спадарожніка. Але, паколькі вельмі многія тэлегледачы палюбілі перадачу і чакалі яе, было вырашана часова выпускаць тыя гісторыі, якія ўжо былі знятыя, у фармаце паўнацэннай рубрыкі. Напрыканцы Юлія Дубоўская параіла аматарам «Чакай мяне. Беларусь» сачыць за тэлепраграмай, каб не прапусціць яе вяртанне ў эфір у ранейшым фармаце.

Сяргей РАСОЛЬКА. *rs@zviazda.by*

■

«ДНО МНОГІХ ВАДАЁМАЎ ПЕРАТВОРАНА Ў СМЕТНІК»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Каб прачасаць вадаём дыяметрам у 20 метраў, спатрэбіліся два апараты на сціснутым паветры. Да таго ж бачнасць у вадзе — як уначы з заплюшчанымі вачыма. Доўгі час туды падалі ствалы дрэў, таму на дне ўтварылася нейкае месіва, якое шчодра разбавілі пластыкавыя і шкляныя бутэлькі. А пры рабоце навобмацак пластыкавая бутэлька вельмі падобная на чалавечую руку.

Каля трох гадзін працягваліся пошукі. Безвынікова. Вадалазы прачасалі і суседняе азярцо. Вынік такі ж — адмоўны. Хлопчык, якога знайшлі, прызнаўся, што ўсё выдумаў...

Добра, што гэтая гісторыя скончылася такім чынам. Але бывае так, на жаль, далёка не заўжды. Акрамя псіхалагічнага фактару, ёсць у нялёгкай, але адказнай рабоце вадалазаў і іншыя адметнасці. Якія ж? Аб гэтым карэспандэнт «Звязды» даведаўся, наведаўшы Цэнтр вадалазна-ратавальнай службы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС.

Бачнасць пад вадой рэдка перавышае метр

— Мы працуем з 1991 года, — расказвае **начальнік Цэнтра вадалазна-ратавальнай службы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС Дзяніс САСНОЎСКІ.** — У 2002-м штатныя вадалазныя службы з'явіліся ў кожным рэгіёне краіны. Цяпер іх налічваецца восем. А яшчэ праз пяць гадоў на Цнянскім вадасховішчы ў Мінску запрацаваў Цэнтр вадалазна-ратавальнай службы для каардынацыі работы падводных спецыялістаў па ўсёй краіне.

З'явіліся ў беларускіх вадалазаў сучасная амуніцыя і абсталяванне. Сярод «фішак» — станцыі хуткага разгортвання. Яны маюць правадную тэлефонную сувязь. Раней жа зносіны вадалаза і берага былі магчымыя толькі дзякуючы сігнальнаму канцу. Да таго ж яны дазваляюць неабмежаваную колькасць разоў мяняць паветра, што павялічвае знаходжанне спецыяліста пад вадой.

Вадалазы звычайна працуюць на глыбіні 6—8 метраў. Але... робяць гэта, па сутнасці, навобмацак. Справа ў тым, што бачнасць у беларускіх вадаёмах вельмі кепская. Нават зімой яна не перавышае 3—5 метраў. А ўлетку і ўвогуле скарачаецца да дыстанцыі выцягнутай рукі. Але трэніравацца для такой складанай работы ёсць дзе.

— На Цнянскім вадасховішчы абсталяваны спецыяльны падводны вадалазны палігон. Ён унікальны ў краіне, — гаворыць **начальнік аддзела вадалазнай падрыхтоўкі Андрэй ВОЙЦІК.** — Стваралі мы яго самастойна. Там уладкаваны трэніровачныя пляцоўкі, на якіх змадэляваны некалькі сітуацый. Гэта і пошук разнастайных прадметаў, і падводная астропка, і ратаванне людзей.

Каб падтрымліваць сваю кваліфікацыю, кожны вадалаз у залежнасці ад свайго разраду мусіць мінімальна правесці на глыбіні ад 50 да 90 гадзін за год. Выканаць гэтую норму няпроста з улікам працоўнага графіку: спецыялісты аддзела вадалазна-ратавальных работ дзяжураць суткі праз двое. І часта знаходзяцца там не адны: вадалазнаму майстэрству вучацца некаторыя прадстаўнікі Міністэрства абароны, органаў унутраных спраў і нават падраздзялення «Алмаз». Вынікі кажуць за сябе — за 4 гады спецыялісты аддзела вадалазнай падрыхтоўкі навучылі сакрэтам прафесіі 157 чалавек.

У 2013 годзе на базе Цэнтра з'явілася мабільная перасоўная баракамера. Яна дапамагае паназіраць, як навабранец пачувае сябе пад вадой пад павышаным ціскам. З ёй працуе ўрач-спецфізіёлаг, які прайшоў падрыхтоўку ў Санкт-Пецярбургу і атрымаў кваліфікацыю вадалазнага ўрача.

Ёсць сярод вадалазаў на Цнянцы і сапраўдны ветэран. Падводны «стаж» **старшага прапаршчыка ўнутранай службы Сяргея АМБРАЖЭЯ** больш чым дваццаць гадоў пераступіў ужо адзнаку ў тысячу гадзін. Ён таксама ўзнагароджаны медалём «За бездакорную службу».

Знайсці нож на дне кар'ера

Здараюцца ў рабоце вадалазаў і так званыя чорныя кур'ёзы. Паступіла паведамленне аб тым, што на Цнянцы патануў чалавек. Тапельца дасталі, але аказалася, што... гэта не той. Нябожчык, якога шукалі, знаходзіўся за 5—7 метраў ад першага.

— Баявыя патроны, нажы знаходзім пастаянна, — расказвае **вадалазны спецыяліст Цэнтра вадалазна-ратавальнай службы МНС Дзмітрый БАРАНОЎСКІ**. — Увогуле, падводны свет — гэта адзін вялікі склад.

Прыводзіць да кур'ёзных выпадкаў і дурасць. Да нас паступіў выклік, што на вадасховішчы Дразды машына пайшла пад лёд. Прыязджаем туды, бачым: стаяць два чалавекі, гутараць. Пачынаем высвятляць абставіны здарэння. Аказалася, хлопцы вырашылі паспрачацца, хто далей па лёдзе праедзе, намалюе васьмёрак у дрыфце і вернецца назад. Выйграў той, чыя машына патанула. Ну што ж, апускаюся. Скажу адразу — такой прыгажосці за ўсё жыццё не сустракаў. Бачнасць у вадзе метраў 5—7. Яркае сонца пераліваецца, асвятляе новы прыгожы джып з усіх бакоў, нібы ў салоне...

Падымаюць вадалазы са дна і тэхніку. Непадалёк ад Заслаўя на кар'еры забуксаваў смеццявоз. На выручку адправіўся трактар, які таксама не адолеў пяскі. Падагналі другі трактар, пасля экскаватар — і праз некаторы час уся гэтая кавалькада апынулася на дне кар'ера. Прычым работу ўскладняе наліпанне грунту. Калі нета-вага таго ж экскаватара складае 37 тон, то пасля таго, як ён праляжыць пэўны час у вадзе, яна можа павялічыцца да 150 тон і нават болей! А вадалазам трэба ўсю гэтую масу пад вадой размыць спецыяльнай установкай. І рабіць гэта хутка. У рэшце рэшт трактары і смеццявоз на бераг выцягнулі.

— А аднойчы паступіла заданне знайсці на дне кар'ера ў Калодзішчах пад Мінскам нож, які мусіў быць рэчавым доказам у крымінальнай справе, — згадвае вадалаз. — Нырнулі ў копанку, дасталі, — а нож не той. Дасталі наступны — зноў не той. Агулам з вады былі выцягнуты шэсць нажоў! Цікава, як яны туды ўсе трапілі?

Дзмітрый Бараноўскі валодае незвычайнай для вадалаза дадатковай спецыяльнасцю. Ён падводны рэзчык-зваршчык металу. Для таго каб навучыцца гэтай прафесіі, трэба ехаць у Расію. І набытыя веды вельмі спатрэбіліся ў 2007 годзе, калі на Заходняй Дзвіне каля Віцебска абваліўся мост. Работу вадалазаў ускладняла тое, што з моста сарвала ўсе злучэнні, і яго канструкцыі ашчэрыліся пікамі вострай арматуры, якая тырчала ва ўсе бакі. Небяспеку стваралі і лёгкаўзгаральныя газы, якія ад работы зварачнага апарату вельмі хутка збіраліся наверсе.

— Але ў мяне нешта апускаецца ў душы, калі да нас паступае выклік на пошукі чалавека на Чыжоўскім вадасховішчы, — працягвае суразмоўнік. — Туды мы ідзём толькі ў «сухім» касцюме. Гэты тэхнічны вадаём — па сутнасці, адна вялікая звалка. Чаго там толькі на дне няма — арматура, бутэлькі і нават футбольныя вароты! Даходзіла нават да таго, што стальныя балкі ламалі вінты нашых катараў. Як па мне, то там праз кожныя 5 метраў трэба ставіць слупок «Купацца забаронена»...

Валяр'ян ШКЛЕННІК.
schklennik@zviazda.by

Фота з архіва Цэнтра вадалазна-ратавальнай службы Рэспубліканскага атрада спецыяльнага прызначэння МНС.

ЯКІМ БЫЦЬ ПАДМІКОЛЛЮ?

У ПОШУКАХ КАНСЭНСУСУ

Тут сышліся гістарычныя, рэлігійныя, прыродаахоўныя інтарэсы. Два месяцы таму «Звязда» пісала пра тое, што частка жыхароў выступіла супраць будаўніцтва ў Падміколлі фестывальнай пляцоўкі і гандлёва-забаўляльнага цэнтра. Іх меркаванні ўлічаны. Але ёсць разыходжанні ў поглядах па іншых пытаннях. Напрыклад, наконт спуску ад плошчы Арджанікідзэ да галоўнага ўваходу ў парк. **Галоўны архітэктар праекта, начальнік архітэктурна-планіровачнага аддзела інстытута «Магілёўграмадзянпраект» Таццяна БЕЛЬСКАЯ** прапаноўвае парадную лесвіцу з ратондамі, глядзельнымі пляцоўкамі і фантанамі. А вось **старшыня Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры Антон АСТАПОВІЧ** лічыць, што танней будзе аднавіць Алейную браму і стварыць падземны пераход. Гэта, маўляў, болей упішацца ў прапанаваны тым жа архітэктарам варыянт «вясельнай зоны» — своеасаблівага востраva са штучнымі воднымі каналамі.

Няма аднадумства ў адносінах развіцця ландшафтна-рэкрэацыйнай зоны Падмікалля. Прыхільнікі гарадской ініцыятывы з аднайменнай назвай, напрыклад, выступаюць за стварэнне тут батанічнага саду і некалькіх паркавых зон для дзяцей, моладзі і людзей больш сталага ўзросту без капітальных збудаванняў.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

АДРАДЖЭННЕ СВЯТЫНІ

Дакладна вядома, што тэрыторыю Падмікалля ўпрыгожыць Свята-Пакроўская царква, дазвол на будаўніцтва якой ужо ёсць. Для праваслаўных яна каштоўная яшчэ і тым, што гэта апошняе месца служэння святога магілёўскага архіепіскапа — свяшчэннамучаніка Паўліна, які быў расстраляны ў 1937 годзе. Па бласлаўленні епіскапа Магілёўскага і Мсціслаўскага Сафронія адраджэннем святыні ўжо сёлета зоймецца Свята-Мікольскі жаночы манастыр.

Свята-Пакроўская царква наогул знамянальны для Падмікалля аб'ект, бо раней, калі яна існавала, мясцовасць так і называлася — Пакроўскі пасад. Рэшткі яе званіцы ў гонар Архангела Міхаіла археолагі знайшлі ў 2014 годзе падчас раскопак. Царква і званіца былі пабудаваны ў XVII стагоддзі і знесены ў 1948 годзе. Храм плануецца аднавіць на тым жа самым месцы, дзе яна і знаходзілася, прыкладна за 400 метраў ад Свята-Мікольскага манастыра.

Дарэчы, тыя, хто жадае паўдзельнічаць у адраджэнні святыні, могуць падтрымаць ініцыятыву, пералічыўшы сродкі на разліковы рахунак манастыра (3135430408011, код 739, БІК 153001739, УНП 700346341).

Абыякавых на круглым стале не было.

Не выключана, што з часам будуць адроджаны і іншыя культавыя будынкі, якія калісьці ўпрыгожвалі Падмікалле, — касцёл Святога Антонія і сінагога. Але на ўсё патрэбны грошы і нават спецыялісты яшчэ не заглядваюць так далёка ў будучыню. «Цяпер дарогу праектуем, будзем прапрацоўваць спуск каля цэнтральнай алеі, першая чарга якой ужо зроблена. Наперадзе яшчэ шмат працы», — каротка растлумачыў галоўны архітэктар горада Уладзімір Скачак.

ДАВЕРЫМСЯ СПЕЦЫЯЛІСТАМ

Актыўнасць грамадзян прымушае спецыялістаў асабліва адказна адносіцца да сваёй задачы.

— У Магілёве вельмі неабыякавая грамадскасць, і тое, што гараджане так хвалююцца за будучыню свайго горада, радуе, — адзначыла намеснік **старшыні Магілёўскага гарвыканкама Ала ГАЛУШКА.** — Не страшна, што так шмат прапаноў. Гэта дае магчымасць знайсці найлепшы варыянт, зрабіць з гэтага месца разыначку.

Старшыня пастаяннай камісіі па эканамічным развіцці, інвестыцыйнай і інавацыйнай дзейнасці, прадпрымальніцтве Магілёўскага гарсавета дэпутатаў Уладзімір КАВУНОЎ лічыць, што ў гэтай справе трэба больш даверыцца прафесіяналам.

Падчас абмеркавання праекта.

— Падмікалле для кожнага магіляўчаніна — знакавае месца, гістарычнае, экалагічнае, — кажа ён. — Таму нельга даваць яго на водкуп грамадскасці. Бо колькі людзей, столькі меркаванняў. Калі кожнае ўлічваць, можна наогул нічога не зрабіць. Але гэтым павінны займацца спецыялісты. Дзякуючы ім у Магілёве ўжо існуюць прыгожыя зоны адпачынку ўздоўж ракі Дубравенкі, у Буйнічах. І гэта будзе не горш.

❍ Каментарый у тэму

Галоўны архітэктар вобласці Аляксей НОВІКАЎ:

— Генеральны план Магілёва распрацоўваўся галаўным інстытутам рэспублікі, яго стварала, аналізавала, абмяркоўвала вялікая колькасць людзей. Падмікалле захаваецца як зона ціхага, актыўнага адпачынку. Прапановы вітаюцца, свежыя ідэі таксама, але праекціроўшчыкі прынцыпова спрабуюць захаваць гісторыю, аднавіўшы частку той архітэктуры, якая характэрна была для губернскага Магілёва.

Дарэчы, па выніках пасяджэння ў адрас БелНІІПгорадабудаўніцтва накіраваны пратакол, дзе, акрамя таго, што горад адмаўляецца ад гандлёва-забаўляльнага цэнтра і фестывальнай пляцоўкі, пазначана неабходнасць распрацоўкі горадабудаўнічага праекта спецыяльнага планавання Падмікалля і стварэння працоўнай групы, у якую ўвойдзе таксама і зацікаўленая ў далейшым развіцці парка грамадскасць.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Дзяржава для народа

Мясцовае Самакіраванне

Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

25 студзеня 2017 г.
№ 2 (386)

стар. 2

Навацыі заканатворцаў для аўтамабільных перавозчыкаў

стар. 7

Некаторыя думаюць, што дэпутатам «плацяць»

стар. 8

Сельская ідылія на новы лад

З ВЫЕЗДАМ НА МЕСЦА

ПАЦЯПЛЕННЕ ІНВЕСТЫЦЫЙНАГА КЛІМАТУ

Пяць прадпрыемстваў за адзін дзень — Савет па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пачаў сваю работу

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Працаваць на «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» прэстыжна. Не дзіва, што вакансіі тут бываюць рэдка.

Першае ў гэтым годзе выязное пасяджэнне Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі прайшло ў Лідскім раёне. Там члены Савета і госці паглядзелі, як прыцягваюцца замежныя інвестыцыі, і абмеркавалі работу органаў мясцовага кіравання і самакіравання. Асноўны крытэрый — выкананне задач, агучаных на V Усебеларускім сходзе.

Спачатку — экскурсія

Першы прыпынак — шклозавод «Нёман». Прадпрыемства, якое робіць адны з самых прыгожых вырабаў са шкла. Дарэчы, у той дзень увечары, пасля візіту Савета па ўзаемадзеянні, «нёманскае» шкляное сэрца ўручылі пераможцам Нацыянальнага адбору на «Еўрабачанне». На вытворчасці не так даўно прайшла мадэрнізацыя — пра яе расказаў дырэктар «Нёмана» Ігар Бацян. Акрамя гэтага, на заводзе імкнуцца паступова зніжаць сабекошт. Эканамічны эфект ад такіх мерапрыемстваў у 2015 годзе склаў 1,6 млн рублёў, у 2016-м — 1,2 млн рублёў. Калі зайшла размова пра заробак, дырэктар адзначыў, што ўзровень у 1000 рублёў можа быць дасягнуты ў бліжэйшы час. «Асабліва на вытворчасці шклаваты зрабіць гэта — элементарна».

стар. 4

СІТУАЦЫЯ

ЦАНА ПЫТАННЯ — 64 КАПЕЙКІ

Як плаціць за вываз смецця вяскоўцам

Вольга Шабіцкая жыве ў вёсцы Вялікая Быхаўшчына Нясвіжскага раёна ў прыватным доме, мае прысядзібны ўчастак у 5 сотак. Вользе Канстанцінаўне 77 гадоў. Яна інвалід II групы. Нясвіжская жыллёва-камунальная гаспадарка (ЖКГ) прапанавала ёй заключыць дамову на вываз цвёрдых бытавых адходаў, але жанчына адмовілася. Як сцвярджае сама, у яе «практычна няма смецця». Яе выклікалі ў суд: камунальнікі падалі іскавую заяву. І цяпер ёй трэба заплаціць тры базавыя велічыні дзяржпошліны. На судовае пасяджэнне у Нясвіж яна прыехаць не можа, паколькі перанесла інсульт. А аўтобус, паводле слоў Вольгі Канстанцінаўны, ходзіць з райцэнтра ў вёску толькі раз на тыдзень. І тады яна звярнулася па дапамогу ў «Мясцовае самакіраванне». На чыім баку праўда, разбіраўся наш карэспандэнт.

стар. 3

СВЯТЛО Ў АКНЕ

ТРЭБА ПРОСТА ЛЮБІЦЬ...

Цяпло і клопат адчуюць маленькія насельнікі двух новых дамоў сямейнага тыпу, што адкрыліся на Гомельшчыне

Прыёмныя дзеці Арсеній, Ліза, Аня і Андрэй з Наталляй АГАФОНАВАЙ.

Цяпер у Гомельскай вобласці стала 43 дзіцячыя дамы сямейнага тыпу. Амаль 300 дзяцей-сірот і дзяцей, пакінутых без апекі бацькоў, выхоўваюцца ў гэтых установах. Дарэчы, 10 гадоў таму такіх дамоў было толькі тры. Два новыя ўрачыста адкрылі напярэдадні новага года: у Чачэрску і Ветцы.

Юныя жыхары будынка, які стаіць у самым цэнтры Веткі, за царквой, абжываюць свае пакойчыкі, расстаўляюць цацкі па паліцах, а гаспадыня Наталля Агафонава вітае гасцей гарбатай з цукеркамі.

Самы малодшы з пяці дзетак, трохгадовы Арсеній, уецца хвосцікам і радасна вітае кожнага, хто ўваходзіць. Родная маці адмовілася ад яго пры нараджэнні. Тут ён упершыню зведаў цеплыню абдымкаў і слова «мама» вымаўляе з абсалютнай упэўненасцю.

стар. 6

БЕЗ ЛІШНЯГА ФАРМАЛІЗМУ,

або Як дэпутат дапамагаў засыпаць катлаван

Гэта адзін з самых вядомых дэпутатаў Палаты прадстаўнікоў мінулага склікання. Вядомы не толькі сярод палітыкаў, але і сярод выбаршчыкаў, Валерый БАРАДЗЕНЯ, дэпутат ад Васняцоўскай выбарчай акругі №93 сталіцы, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па бюджэце і фінансах, быў перавыбраны другі раз. Ён асабіста ведае значную частку сваіх выбаршчыкаў, знаёмы з іх жыццём і патрэбамі. Пра тое, як яму працуецца ў акрузе, Валерый Барадзеня расказаў нашаму выданню.

На першым месцы скаргі

— У мінулым 2016 годзе асноўнай падзеяй для дэпутатаў былі выбары ў Палату прадстаўнікоў, — звяртае ўвагу ён. — У выніку сфарміраваўся новы склад, і гэта пэўнага роду стрэс: само сабой, для палітычнай сістэмы, для сакратарыята Палаты прадстаўнікоў. Новы склад парламента маладзейшы, чым мінулы. Мяне радуе, што будзе пераемнасць, таму што больш за чвэрць складаюць дэпутаты, якія маюць пэўны вопыт. Мне здаецца, новы склад Палаты прадстаўнікоў паспяхова пераняў эстафету, калектыў фарміруецца. Думаю, мы зможам прадукцыйна працаваць — як гэта было ў мінулыя чатыры гады.

Што да работы ў акрузе, то па рэгламенце Палаты прадстаўнікоў дэпутатам адводзіцца на гэта тыдзень.

— Мы з маёй памочніцай Антанінай Піліпаўнай Зінкевіч вядзём прыём — першы і другі панядзелак кожнага месяца. Мае выбаршчыкі ведаюць пра гэта.

І калі дэпутаты з рэгіёнаў вымушаны даваць у газеты аб'явы пра прыёмы — таму што, як правіла, не заўсёды атрымліваецца быць у акрузе ў адзін і той жа час кожны месяц, — то сталічнаму дэпутату, па словах суразмоўцы, з гэтым прасцей.

— У Мінску акругі вельмі кампактныя. У мяне, напрыклад, недзе пяць на пяць кіламетраў. Такім чынам, тыя два дні прыёму мяне цалкам задавальняюць. Ёсць пастаянныя «кліенты». У асноўным прыходзяць са скаргамі. Натуральна, хацелася б, каб была, як належыць па тэорыі, нейкая заканадаўчая ініцыятыва... Людзі скардзяцца на ЖКГ, на мясцовыя ўлады. Але самае сумнае і непрыемнае — калі яны скардзяцца на сваякоў, адзін на аднаго. Гэта ўвогуле катастрофа! Тут можна толькі развесці рукамі, бо гэта міжасобасныя адносіны. Калі людзі пачынаюць так скардзіцца, даводзіцца тлумачыць, што ніхто ім не дапаможа — акрамя, хіба што, іх саміх.

У сярэднім у кожны «прыёмны» панядзелак прыходзяць пяць-дзесяць чалавек. Калі дачны перыяд пачынаецца, то наведвальнікаў становіца менш.

З кім перапісваюцца дэпутаты?

— Даволі шмат паступае сацыяльна значных калектыўных зваротаў — напрыклад, абрэзаць дрэвы. Або дом прамярзае, і мясцовая ўлада ніяк не можа вырашыць праблему. Неяк скардзіліся, што выросла бяроза на даху. Згодна з Законам «Аб зваротах грамадзян», калі да нас прыходзяць калектыўныя звароты, мы іх накіроўваем тым, хто павінен вырашаць гэтыя пытанні. Калі пад зваротам падпісалася больш чым 30 чалавек, то пытанне разглядаецца з выездам на месца. Мы павінны туды прыехаць і самі на прычыну звароту паглядзець.

Парламентарый падкрэслівае, што з выканаўчай уладай як у Заводскім раёне, так і ў Ленінскім заўсёды атрымліваецца знайсці агульную мову. Некаторыя пытанні вырашаюцца вельмі марудна, таму што патрабуюць фінансавання. Тым не менш яны вырашаюцца.

— Быў выпадак з катлаванам, які ледзь закапалі. Ён пятнаццаць гадоў быў разрыты! Прыватнік выкупіў участак, раскапаў яму, паставіў палі — і знік. Скаргі ж пайшлі ад школы — калі выпадаў снег, дзеці ішлі ў гэты катлаван, каб пакатацца з горкі. Там арматура, жалеза. Дырэктар баяўся, што хто-небудзь разаб'ецца. Усё-такі праблему вырашылі, катлаван закапалі — пасля доўгай перапіскі. Тут жа юрычныя пытанні: каму належыць, хто павінен адказваць. А бізнесмен на судовыя пасяджэнні не прыходзіў.

> Можна дзейнічаць у рамках закона, але не бачыць, што ідзеш супраць сацыяльна скіраванай палітыкі дзяржавы. Выразна рэгламентаваць кожны крок кожнага чалавека ў законах немагчыма ўвогуле!

Дэпутат таксама з усмешкай успамінае, як яны з Антанінай Піліпаўнай лазілі ў падвалы. Былі неаднаразовыя скаргі ад людзей на тое, што падвалы затапляе. Схадзілі, паглядзелі — сапраўды. Пасля запрасілі прадстаўнікоў улады, каб тыя таксама пабачылі на свае вочы, што адбываецца, а не прыкрываліся адпіскамі. Скаргі, адзначае Валерый Барадзеня, могуць быць якімі заўгодна, але ж трэба праверыць, ці так яно на самай справе.

— На жаль, у органы мясцовай улады часам прыходзяць людзі без вопыту работы, якія не зусім разумеюць місію сваёй дзейнасці. Можна дзейнічаць у рамках закона, але не бачыць, што ідзеш супраць сацыяльна скіраванай палітыкі дзяржавы. Выразна рэгламентаваць кожны крок кожнага чалавека ў законах немагчыма ўвогуле!

Валерый Анатолевіч ганарыцца выпадкам, калі ўдалося дапамагчы пажылой жанчыне. Сітуацыя была такая. Муж і жонка

пражылі ўсё жыццё ў службовым памяшканні, якое калісьці выдзялялі дворнікам. Падышоў час прыватызацыі. Аказалася, што муж яе адпрацаваў толькі восем гадоў у гэтай сістэме з неабходных 10, а яна адпрацавала 30. Але ордар на службовае памяшканне ў далёкіх 70-х гадах быў афармлены менавіта на мужа. Такім чынам, жанчына не магла прыватызаваць кватэру.

— Але ж да 90-х гадоў у нас не было раздзялення «муж-жонка», асновай ўсяго была сям'я. Нікому ў галаву не магло прыйсці ў той час: з-за таго, што муж памяняў работу, ордар перапісваць на яго жонку... Недзе год мы змагаліся, і ўсё-такі жанчына, нарэшце, змагла прыватызаваць кватэру.

Замест ініцыятывы — канцэпцыя

— Былі і заканадаўчыя ініцыятывы — тыя, што я ўнёс і ў сваю выбарчую праграму, а цяпер імкнуся неяк рэалізоўваць, — расказвае Валерый Барадзеня. — Супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага эканамічнага ўніверсітэта, напрыклад, распрацавалі цэлую канцэпцыю дэкрыміналізацыі заканадаўства.

> Людзі скардзяцца на ЖКГ, на мясцовыя ўлады... Але самае сумнае і непрыемнае — калі яны скардзяцца на сваякоў, адзін на аднаго.

Валерый Анатолевіч дастае гэтую канцэпцыю.

— Я паслаў яе ў Нацыянальны цэнтр заканадаўства і прававых даследаванняў. Але і сам ёй карыстаюся. Вось, напрыклад, ёсць распрацоўка па ўдасканаленні сістэмы мер адміністрацыйна-крымінальнай адказнасці за правапарушэнні ў сферы эканамічнай дзейнасці. Нават склалі праект указа Прэзідэнта. Натуральна, гэта тое, для чаго дэпутаты і працуюць. Калі прыходзяць з такога роду дакументамі, то гэта вельмі дапамагае.

Дарэчы, эканамічны ўніверсітэт знаходзіцца на тэрыторыі акругі дэпутата, яго калектыў і вылучыў Валерыя Барадзеню падчас парламенцкіх выбараў у 2012 годзе. Мой суразмоўца прызнаецца, што сувязяў з родным універсітэтам не парывае, працуе на кафедры лагістыкі і цэнавай палітыкі на палову стаўкі, і яго студэнты рэгулярна наведваюць Палату прадстаўнікоў.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

МАБІЛЬНАЕ ТАКСІ

Якія навацыі рыхтуюць заканатворцы для аўтамабільных перавозчыкаў

Ці прыжывуцца лічбавыя тэхналогіі ў транспартнай галіне? Наколькі бяспечна рэгістраваць свае плацежныя карткі ў мабільных сістэмах? Ці знікнуць таксометры з аўтамабіляў, што перавозяць пасажыраў? Гэтыя пытанні абмяркоўвалі дэпутаты і прадстаўнікі міністэрстваў на пашыраным пасяджэнні Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі, прысвечаным дапрацоўцы праекта закона «Аб унясенні дапаўненняў і змяненняў у Закон «Аб аўтамабільным транспарце і аўтамабільных перавозках».

— Працоўная група па законапраекце разгледзела пытанне прымянення лічбавых тэхналогій у транспартнай галіне, у прыватнасці, у арганізацыі перавозак аўтамабілямі таксі, — расказвае **Андрэй РЫБАК, старшыня названай Пастаяннай камісіі**. — Сёння бізнес ужо шырока прапануе гэтыя тэхналогіі, як правіла, гэта мабільныя праграмы, якія дазваляюць не толькі заказаць паслугу, але і разлічыць папярэдні кошт, ідэнтыфікаваць перавозчыка, транспартны сродак, ацаніць якасць паслуг і нават безнаяўна аплаціць. На жаль, гэтыя тэхналогіі не знаходзяць дастатковага адлюстравання ў заканадаўстве. Усё гэта прыводзіць да пэўных спрэчных момантаў.

Да апошніх можна аднесці немагчымасць абараніць інтарэсы пасажыра, пытанні бяспекі перавозкі, а таксама бяспекі тых звестак, якія перадаюцца перавозчыку, — у тым ліку і персанальныя даныя плацежнай карткі.

— Ужо сёння тыя мабільныя праграмы, напрыклад, што выкарыстоўваюць Uber і іншыя кампаніі, улічваюць адпаведныя магчымасці. Але якія ёсць балючыя пытанні? Па-першае, перавозчыкі, якія выкарыстоўваюць праграмы, ужо фактычна пазіцыянуюць сябе як крыху іншы від перавозак. Сёння мы не павінны падыходзіць да гэтых перавозчыкаў як да нейкіх людзей, што падпрацоўваюць, гэта значыць не можам вяртацца ў 90-я гады, калі чалавек зарабляе такім чынам пасля працы. Таму першае пытанне, якое павінна знайсці адлюстраванне ў заканадаўстве: усе патрабаванні, якія існуюць сёння да аўтамабіляў таксі, павінны датычыцца і гэтых перавозчыкаў таксама.

Пытанне ёсць і ў тым, што калі ўсё-такі Uber з'яўляецца добрай мабільнай праграмай, якая ў тым ліку дазваляе і правесці безнаяўную аплату, дык ці неабходны тады таксометры і касавыя падсумоўваючыя апараты?

— Відаць, трэба ўжо рухацца далей. Калі гэта мабільная праграма зарэгістравана ў Міністэрстве сувязі, то магчыма адмовіцца ад таксометра. Хоць гэта дастаткова складаны крок. Трэцяе пытанне, якое я абазначыў бы як адно з ключавых, — гэта пытанне аб выкарыстанні плацежных картак. Выкарыстоўваючы вышэйназваную мабільную праграму, вы зарэгістравалі сваю плацежную картку. Ёсць практыка, калі той жа Uber нават не з'яўляецца рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь. І вось інфармацыя пра вашу плацежную картку паступіла ў гэтую сістэму...

У цэлым у законе, па словах старшыні Пастаяннай камісіі, неабходна прапісаць паняцце электронных інфармацыйных сістэм з магчымасцю аплаты, рэгламентаваць, як кожны ўдзельнік рынку можа імі карыстацца, якая ступень адказнасці і правоў на кожным этапе. Адпрацаваўшы такія моманты, можна сапраўды прыйсці да таго, што адпаведныя паслугі будуць больш шырока прадстаўлены на рынку, а іх якасць вырасце. Павысіцца і бяспека перавозак.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

ЦАНА ПЫТАННЯ — 64 КАПЕЙКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Мы аказваем паслугі, якія раздзяляюцца на асноўныя і дадатковыя. Асноўныя — гэта вываз цвёрдых бытавых адходаў ад насельніцтва, — растлумачыла **начальнік аддзела юрыдычнай і кадравай работы ўнітарнага прадпрыемства «Нясвіжская камунальная гаспадарка» Наталля ДРАЧЭНКА**. — Забіраем іх, вывозім, сартуем на адпаведных пунктах, а тое, што непрыгоднае, утылізуем на палігонах. Канешне, мы нясём матэрыяльныя затраты, таму дзяржава выдзяляе нам датацыі. У мадэрнізацыю ўкладваем і свае сродкі. Паколькі вываз цвёрдых бытавых адходаў, паўтаруся, асноўная паслуга, то мы абавязаны яе аказваць усяму раёну. Для гэтага распрацаваны графікі аб'езду падворкаў спецыяльнымі машынамі. Аўтамабіль спыняецца каля кожнага жылога дома, і грузчык забірае адходы, якія жыхары ставяць у пакетах за вароты. Гэта па тых вёсках, дзе няма абсталяваных кантэйнерных пляцовак. Яны ўстаноўлены толькі ў Нясвіжы, гарадскім пасёлку Гарадзея, а таксама ў некаторых аграгарадках каля шматкватэрных жылых дамоў. У Вялікай Быхаўшчыне, дзе пражывае Вольга Канстанцінаўна, смецце вывозіцца ў другую і чацвёртую сераду кожнага месяца. Ніякіх нараканняў ад жыхароў няма.

— Наталля Васілеўна, і ўсё ж колькі каштуе для жыхароў вываз цвёрдых бытавых адходаў? Магчыма, для Вольгі Канстанцінаўны як пенсіянеркі, інваліда гэта непад'ёмная сума?

— На аднаго зарэгістраванага ў доме за вываз адходаў налічваецца 1 рубель 29 капеек штомесяц. Паколькі Вольга Канстанцінаўна інвалід, на яе распаўсюджваецца 50-працэнтная льгота. Атрымліваецца, што цана спрэчкі — 64 капейкі. Гэтыя тарыфы ўзятыя не з неба: яны разлічаны і зацверджаны Міністэрствам жыллёва-камунальнай гаспадаркі.

— Жанчына сцвярджае, што ў яе наогул вельмі мала смецця збіраецца. І яна яго спальвае...

— У любым выпадку смецце ёсць. Ды і па экалагічных нормах, а таксама правілах пажарнай бяспекі спальваць яго нельга — так нядоўга і да бяды. Акрамя таго, паслугу па вывазе смецця, як асноўную, можа аказваць і без дагавора. Але мы імкнёмся, каб у нас з грамадзянамі былі дагаворныя абавязацельствы. Тым, хто адмаўляецца ісці на гэта, мы адрасуем пісьмы, тлумачым сутнасць справы, папярэджваем. І толькі пасля патрабуем аформіць усё належным чынам.

— А калі чалавек усё роўна ўпарта стаіць на сваім, адмаўляецца?

— У такім выпадку звяртаемся ў суд. Што датычыцца Вольгі Канстанцінаўны, то суд пайшоў ёй насустрач. Паколькі яна інвалід, то суддзя, сакратар, прадстаўнікі жыллёва-камунальнай гаспадаркі правялі пасяджэнне па месцы жыхарства жанчыны ў вёсцы Вялікая Быхаўшчына. Суддзя папярэдне правёў з ёй гутарку.

Напачатку Вольга Канстанцінаўна пагадзілася заключыць дамову ў тым выпадку, калі каля яе дома абсталююць кантэйнерную пляцоўку. Але гэта затратна, яе трэба забетанаваць, устанавіць ёмістасць, захаваць усе санітарныя нормы. Разам з тым у такім выпадку для вывазу бытавых адходаў неабходны спецыяльны кантэйнераво з баковой загрузкай, што цягне за сабой дадатковыя затраты... Чалавек можа і самастойна набыць кантэйнер або ўзяць яго ў арэнду ў спецыялізаваных арганізацый. У прынцыпе і мы маем магчымасць яго прадаставіць. Адходы ў гэтым выпадку забіраем раз у месяц, але каштаваць такая паслуга будзе значна больш, чым падворны вываз! Акрамя таго, ёсць інструкцыя па арганізацыі раздзельнага збору, захаванні і перапрацоўцы камунальных адходаў, дзе канкрэтна прапісана, што кожны ўласнік можа абсталяваць спецыяльна адведзенае месца для складзіравання смецця на сваім зямельным участку. Яно вывозіцца прыкладна раз у паўгода, калі яма цалкам запаўняецца.

Усё гэта мы растлумачылі Вользе Канстанцінаўне, і яна ў добраахвотным парадку заключыла з намі дагавор. Мы адмовіліся ад іску ў адносінах да яе і заключылі міравую. Калі б суд прыняў рашэнне на нашу карысць, то ёй давялося б аплаціць дзяржпошліну ў памеры 63 рублі.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

СТАЛІЧНЫЯ НАВІНЫ

Індыкатар задаволенасці

У Мінску правядуць апытанне аб якасці паслуг ЖКГ

Зараз зацвярджаецца канчатковы спіс пытанняў, а таксама вызначаецца, якім чынам будзе праходзіць выбарка ўдзельнікаў анкетавання. Выказаць сваё меркаванне мінчане змогуць ужо пачынаючы з другой паловы студзеня і да канца бягучага года. Анкеты будуць разносіць па паштовых скрынях, для збору адказаў у дамах установяць спецыяльныя урны. Акрамя таго, адказаць на пытанні можна будзе і праз інтэрнэт: анкету размесцяць на сайтах раённых ЖКГ, запоўненую форму можна будзе адправіць па электроннай пошце.

Як адзначыў **намеснік генеральнага дырэктара дзяржаўнага аб'яднання «Мінская гарадская жыллёвая гаспадарка» Аляксей ГЕРАСІМЧЫК**, галоўная мэта анкетавання — практычная. У планах — не проста правесці сацыялагічнае даследаванне і даведацца меркаванне жыхароў горада па тых ці іншых пытаннях, а выкарыстаць атрыманыя звесткі для паляпшэння работы галіны ў цэлым і вырашэння канкрэтных праблем у прыватнасці. Падобныя апытанні праходзяць у сталіцы не ўпершыню, аднак раней іх вынікі дазвалялі ацаніць сітуацыю ў мікрараёне, а гэта 2—3 розныя ЖЭУ. Цяпер жа павінна быць атрымана больш пашыраная інфармацыя — у тым ліку і аб прадметах павышанай увагі жыхароў асобных дамоў.

Пакуль вызначана, што ў анкеце будзе 9 пытанняў, накіраваных на ацэнку задаволенасці насельніцтва аказаннем жыллёва-камунальных паслуг. Напрыклад: як змянілася якасць паслуг за мінулы год? Ці звярталіся вы ў спецыялізаваныя арганізацыі (кантакт-цэнтр ЖКГ, гарадская аварыйная служба, разлікова-даведачны цэнтр) на працягу апошніх 3 месяцаў? Калі так, то як вы можаце ацаніць якасць аказанай вам дапамогі? Пад кожным пытаннем некалькі варыянтаў адказу, якія ўключаюць палярныя меркаванні.

Асаблівая ўвага будзе нададзена тэме, звязанай з асабістай гатоўнасцю жыхароў прымаць удзел у добраўпарадкаванні тэрыторый, напрыклад рамонце пад'ездаў або правядзенні суботнікаў. Гэта дасць магчымасць па-новаму пабудаваць узаемадзеянне службаў ЖКГ і мінчан.

Хутчэй за ўсё, выбарка будзе праводзіцца па серыі дамоў, напрыклад 5-, 9- і 12-павярхоўках розных гадоў па ўсіх раёнах сталіцы. На гэты момант у Мінску больш за 800 тысяч асабовых рахункаў, па кожным з якіх праводзіць анкетаванне сэнсу не мае. Калі такое маштабнае даследаванне пройдзе паспяхова, то верагодна, што яно стане перыядычным. Прыняць удзел у апытанні можна ананімна, дастаткова пазначыць нумар дома.

Дар'я КАСКО. *kasko@zviazda.by*

АБМЯРКУЕМ

УТРЫМАНЦАЎ СТАНЕ МЕНШ?

Згодна са зменамі ў Дэкрэце №3 «Аб папярэджанні сацыяльнага ўтрыманства», дэпутаты мясцовых Саветаў могуць цяпер вызваляць грамадзян ад выплаты збору, калі тыя знаходзяцца ў цяжкай жыццёвай сітуацыі. Наш карэспандэнт высветліў, як старшыні Саветаў дэпутатаў пярвічнага ўзроўню ставяцца да гэтых змен.

— У гэтым годзе да нас ужо звярталіся тыя, хто займаецца гаспадаркай, дапамагае бацькам апрацоўваць зямлю, — расказвае **старшыня Галубіцкага сельскага Савета дэпутатаў Глыбоцкага раёна Пётр СУПРАНЁНАК**. — Бываюць і цяжкія сітуацыі, напрыклад калі чалавек звольніўся, але не змог знайсці новую работу па спецыяльнасці. Папраўка была неабходная, каб абараніць добрапрыстойных грамадзян. А тыя, хто не працуе свядома, — няхай плацяць збор.

А **старшыня Вяліканямкоўскага сельскага Савета дэпутатаў Веткаўскага раёна Уладзімір СОНІЧ** гаворыць, што ў іх такіх зваротаў не было. «Лісты шчасця» атрымалі адзінкі: тыя, хто сапраўды не працаваў, або тыя, хто атрымліваў даход не ў нашай краіне. «Папраўку варта было ўводзіць, але сама па сабе яна не вельмі істотная. Трэба найперш вырашаць праблему з працаўладкаваннем. Ёсць людзі, якія хочуць працаваць, а няма дзе. Гэта першапрычына. Я думаю, гэты дэкрэт будзе яшчэ дапрацоўвацца», — гаворыць старшыня Савета.

Згодны з ім і **Аляксандр МЯКІНКА, старшыня Ракаўскага сельскага Савета дэпутатаў Валожынскага раёна**. Ён таксама адзначыў, што дэкрэт можна дапрацоўваць, каб зрабіць больш дасканалай сістэму, каго вызваляць, а каго не. Нават з ільготамі, якія зараз атрымалі непрацуючыя, можа быць не ўсё так проста.

> “Папраўку варта было ўводзіць, але сама па сабе яна не вельмі істотная. Трэба найперш вырашаць праблему з працаўладкаваннем. Ёсць людзі, якія хочуць працаваць, а няма дзе.

Каб справядліва налічыць збор, трэба, каб была даведка. **Старшыня Вайковіцкага сельскага Савета Навагрудскага раёна Святлана МАКАР** гаворыць, што да яе ўжо звярталіся грамадзяне з просьбамі пазбавіць іх ад падатку. Раней сельвыканкам выдаваў даведкі ў адвольнай форме, з гэтага года — стандартныя. У іх прапісвалася, колькі зямлі ва ўласнасці, якая падсобная гаспадарка. Даведка выдаецца на главу сям'і з азначэннем, колькі людзей былі прапісаны ў гэты перыяд. «Быў адзін выпадак — чалавек працаваў на сезонных работах качагарам, зарплата маленькая, — неяк трапіў у лік тых, каму налічылі збор. Прынёс даведку з працы — мы яго вызвалілі ад збору. Так пытанні і вырашаем».

А ў Верамейскім сельсавеце ўсталявалася практыка, што па даведкі аб вызваленні ад збору ідуць у райвыканкам. **Старшыня Верамейскага сельскага Савета дэпутатаў Чэрыкаўскага раёна Ірына КРЫКСІНА** гаворыць, што да іх звычайна звяртаюцца па кансультацыю і даведкі аб зямельных участках. Яны, у сваю чаргу, раяць, як зрабіць у кожнай асобнай сітуацыі.

Таццяна ШЧАРБАЦЭВІЧ, старшыня Крошынскага сельскага Савета Баранавіцкага раёна, адзначае, што тыя, хто не хоча працаваць, звычайна са скаргамі не звяртаюцца. Бываюць розныя сітуацыі: у каго інваліднасць, хто бацькоў даглядае. «Я сачу за прэсай, як разглядаюцца жыццёвыя выпадкі, звязаныя з гэтым зборам. У нас спачатку, калі ўвялі гэты падатак, было шмат зваротаў — мы тлумачылі, што да чаго. Але скаргаў і канфліктаў не ўзнікала. Трэба сказаць, што праца на зямлі, вядзенне сваёй гаспадаркі — гэта таксама цяжка: трэба карміць і сябе, і сям'ю».

Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

ДАСЛОЎНА

І ДАПАМАГАЦЬ, І ПАТРАБАВАЦЬ

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч — пра...

...уцягванне ў гаспадарчы абарот камунальнай уласнасці

«У 2016-м планы па ўключэнні ў абарот камунальнай уласнасці выкананы ўсяго толькі на 65%. З 1115 аб'ектаў 723 былі ўцягнутыя ў эканамічную дзейнасць. Пры гэтым Гродзенская вобласць спрацавала лепш за іншыя: выйшлі амаль на 100%. У той жа час Віцебская — 47%. Горш за ўсіх Мінск — 32%. А Савет дэпутатаў павінен у першую чаргу гэтым займацца, таму што пытанне зямлі — гэта кампетэнцыя адпаведнага Савета».

...навуку

*«Мы нядаўна з Уладзімірам Краўцовым (старшыня Гродзенскага аблвыканкама. — **Аўт.**) наведвалі Гродзенскі зянальны інстытут раслінаводства НАН Беларусі. Гэта досыць паспяховая навуковая арганізацыя, якая працуе па прыкладной тэматыцы. Яго дзейнасць дастаткова эфектыўная — толькі 11% сродкаў ён бярэ з бюджэту, астатнія — зарабляе. Значыць, яго НДДКР (навукова-даследчыя і доследна-канструктарскія работы. — **Аўт.**), селекцыйныя матэрыялы запатрабаваныя. А што ў іншых галінах? Паспяховыя тыя, хто ўкладвае ў перспектыўныя распрацоўкі.».*

...узаемадзеянне органаў мясцовага кіравання і самакіравання

«У цяперашні час склалася такая практыка, калі Саветы дэлегуюць свае паўнамоцтвы выканкамам. Наша заканадаўства гэта не забараняе, але Саветы дэпутатаў не павінны так працаваць. Возьмем бюджэтнае планаванне. Гэта ж выключная кампетэнцыя Савета, і ў нашым заканадаўстве замацаваны стабільныя крыніцы даходаў. Практыка паказвае, што Саветы фармальна падыходзяць да разгляду бюджэтаў і фактычна галасуюць за тое, што распрацавалі адпаведныя выканкамы. Я не заклікаю да канфрантацыі або перацягвання коўдры. Было б што дзяліць у гэтым бюджэце. Але разам з тым трэба глядзець, на якія мэты накіроўваюцца адпаведныя бюджэтныя сродкі і, можа быць, дзесьці больш акумуляваць сродкі для таго, каб яны давалі аддачу».

...бюракратыю

«Мы ў Савеце Рэспублікі распрацавалі адпаведны падыход: пры паспяховым выкананні заданняў пяцігодкі трэба прыняць каля 120 нарматыўна-прававых актаў. Гэта не толькі законы, але і ўказы, дэкрэты Прэзідэнта, распараджэнні ўрада для таго, каб прыбраць бюракратызм, які прысутнічае ў многіх, на жаль, кірунках дзейнасці. Гэта датычыцца не толькі малога і сярэдняга прадпрымальніцтва або прыватнага бізнесу, вельмі шмат яшчэ непаваротлівасці ў рабоце дзяржаўных прадпрыемстваў. Трэба дапамагаць, але трэба і патрабаваць. У нас на кожным прадпрыемстве, у кожнай сельскагаспадарчай арганізацыі ёсць дэпутацкія групы, і неабходна, каб сесіі гарадскіх і раённых Саветаў разглядалі прынцыпова гэтую работу. Хоць на паперы ўсё як бы добра, фармалізму тут дастаткова».

...экспарт

«Мы кажам, што ў нас экспартаарыентаваная эканоміка. Гэта правільна, але ў сусветным экспарце доля Рэспублікі Беларусь — 0,18%. Ды і доля Еўразійскага эканамічнага саюза ўсяго толькі 2,9%. Мы яшчэ вельмі слабенькія экспарцёры, мы не ўмеем працаваць на знешніх рынках. На гэтым, вядома, адбіваецца тое, што ў нас была калісьці закрытая самадастатковая эканоміка. Але сёння вага знешняга гандлю цягне за сабой у тым ліку стабільнасць абменнага курсу нацыянальнай валюты. Не будзе экспартнай выручкі — не будзе ўстойлівай нацыянальнай валюты».

...Саюзную дзяржаву

«Савету Рэспублікі і Савету Федэрацыі, органам прадстаўнічай улады Рэспублікі Беларусь і Расійскай Федэрацыі неабходна скаардынаваць работу па гарманізацыі заканадаўства і паглыбленні інтэграцыйных працэсаў. Але мы павінны быць аб'ектыўнымі. Нягледзячы на 25-гадовыя інтэграцыйныя працэсы, у саюзным будаўніцтве, на жаль, так і не дасягнута галоўная мэта — стварэнне роўных умоў для суб'ектаў гаспадарання нашых краін і для грамадзян Беларусі і Расіі. Часам і ў расійскіх СМІ, і з вуснаў палітыкаў Расіі даводзіцца чуць папрокі ў адрас беларусаў, што мы ўвесь час просім нейкія прэферэнцыі. Гэта зусім не так. Мы паслядоўна, аргументавана настойваем на роўных умовах для прадпрыемстваў і грамадзян на адзінай беларуска-расійскай прасторы».

ПАЦЯПЛЕННЕ ІНВЕСТЫЦЫЙНАГА КЛІМАТУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Старшыня Бярозаўскага гарадскога Савета дэпутатаў Валерый Яводзік у сваю чаргу звярнуў увагу на тое, што рашэннем гарвыканкама ўся тэрыторыя горада замацаваная за арганізацыямі, у тым ліку за шклозаводам «Нёман». Гэта азначае, што яны адказваюць за навядзенне парадку на пэўнай, напрыклад, вуліцы. Прыкладна два разы на год супрацоўнікі на сваёй тэрыторыі праводзяць месячнікі, а на працягу года даглядаюць яе, падтрымліваюць чысціню.

Пасля Бярозаўкі члены Савета накіраваліся на Лідскі ветэрынарна-санітарны ўтылізацыйны завод. Там яны паглядзелі, як арганізаваны замкнёны ланцужок вытворчасцяў. Прадпрыемствы накшталт гэтага існуюць у Літве і Латвіі. З Літвы і прыйшла кампанія «Марыямпалес АРВІ», якая вырашыла, што Беларусі патрэбен свой завод. Ён, дарэчы, прыцягнуў 23 млн рублёў інвестыцый у раён. Унікальнае прадпрыемства ажыццяўляе збор і перапрацоўку прадуктаў жывёльнага паходжання. Нават калі жывёла памерла ад нейкай хваробы, на вытворчасці змогуць яе бяспечна ўтылізаваць. У выніку атрымліваюць два прадукты: мяса-касцявую муку (зараз ідуць перамовы, каб пашырыць яе экспарт і прадаваць у Бангладэш і В'етнам) і тэхнічны тлушч, які ў Еўрасаюзе выкарыстоўваюць для вырабу біяпаліва. У хуткім часе запрацуе другая лінія, што дасць магчымасць павялічыць аб'ёмы вытворчасці ў 1,9 раза.

Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

Мінойтаўскі рамонтны завод павялічыў экспарт да 57%.

Іншае прадпрыемства, якое пабудавала гэтая ж літоўская кампанія, — «Арвібелагра». На ім вырошчваюць індыкоў. Дарэчы, у нашай краіне ў сярэднім ужываюць 200 грамаў мяса індычкі на душу насельніцтва, у той час, як у Еўропе гэты паказчык — 4 кілаграмы. Лічыцца, што гэта мяса больш карыснае, бо амаль не мае халестэрыну. На прадпрыемстве расказалі, што адзін з дырэктараў школ алімпійскага рэзерву ўжо заказаў партыю прадукцыі для сваіх спартсменаў.

Памятаць пра галоўнае

Дырэктар Мінойтаўскага рамонтнага завода ўпэўнены, што для яго прадукцыі канкурэнтаў няма. Прадпрыемства з кожным годам павялічвае экспарт: калі ў 2015-м ён складаў 39%, то ў 2016-м ужо 57%. На гэтым выніку адбіліся і пастаўкі ва Украіну, якія былі адноўленыя. Дарэчы, аб'ёмы вытворчасці за мінулы год выраслі на 16%.

Прыкладам, як зрабіць завод больш эканомным, стаў «Бел-Пласт Інтэрнэшнл» — прадпрыемства, якое вырабляе пластыкавую тару для бытавой хіміі, касметыкі і прадуктаў харчавання. Зараз яно пачынае рэалізоўваць новы праект па вытворчасці ПЭТ-бутэлек — празрыстай тары высокай якасці для касметыкі і бытавой хіміі. На заводзе стаіць спецыяльная ўстаноўка, якая дазваляе эканоміць электраэнергію, а таксама ўсталявана сістэма рэкумерацыі — яна бярэ цеплыню ад машын і перадае ў батарэі.

Старшыня Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаіл Мясніковіч расказаў, чым яшчэ цікавіліся

ПАРТНЁРАЎ

Летась некаторыя з прадпрыемстваў Лідскага раёна выйшлі на рынкі новых краін, такіх, як Бангладэш, М'янма, Балгарыя, Гвінея і іншыя... Пра тое, з якімі вынікамі Лідчына падышла да новага года, мы пагаварылі са старшынёй раённага Савета дэпутатаў, членам Пастаяннай камісіі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Інэсай БЕЛУШ.

Што прываблівае?

У 2016-м Ліда супрацоўнічала з 70 суб'ектамі Расійскай Федэрацыі, што на дзесяць больш, чым у 2015-м. Адкуль столькі новых сувязяў? У раёне сістэмна з 2005 года праводзяцца мерапрыемствы па прыцягненні інвестараў. Спачатку гэта былі выставы «Ліда — рэгіён», дзе дэманстраваліся магчымасці эканомікі раёна. Запрашаліся прадстаўнікі дыпламатычнага корпуса, акрэдытаванага ў краіне, дэлегацыі гарадоў-пабрацімаў...

— Калі першапачаткова колькасць гасцей і ўдзельнікаў налічвалася каля сотні, то потым кола ўдзельнікаў выросла да трохсот прадстаўнікоў з 16 розных краін, — расказвае Інэса Белуш. — У выніку такіх візітаў напрацаваны кантакты і вялікі вопыт. Інвестыцыі ідуць туды, дзе ёсць давер. Пабудаваны прадпрыемствы з замежным капіталам: з амерыканскім — «БЕЛТЭКС-ОПТЫК», з нямецкім — «ХАВЕР ВУ металатканы завод» і іншыя. Практычна штогод у рамках мерапрыемстваў падпісваліся новыя дамовы і пагадненні.

Старшыня раённага Савета дэпутатаў Інэса БЕЛУШ.

З цягам часу прыйшлі новыя формы пазіцыянавання свайго рэгіёна — форумы. Толькі летась адбыліся два такія мерапрыемствы. Вядзецца работа па арганізацыі аналагічных сустрэч у 2017 годзе — такое даручэнне даў старшыня райвыканкама Міхаіл КАРПОВІЧ.

У Лідзе развіваюцца каля дзесяці галін прамысловасці. Арганізацыі раёна заўсёды арыентаваліся на экспарт. Дарэчы, апошняе дзесяцігоддзе ў Лідчыны стабільнае дадатнае сальда знешнеэканамічнага абароту. Прывабным для інвестараў становіцца і тое, што тэрыторыя раёна часткова ўваходзіць у СЭЗ «Гроднаінвест» — гэта дае падатковыя бонусы для вытворчасці. Ліда актыўна прыцягвае турыстаў. Летась у сямі крамах раёна была ўведзена сістэма вяртання падатку на дабаўленую вартасць TAX FREE. А яшчэ былі распрацаваны новыя турыстычныя маршруты, якія прадставілі на XII Міжнародным беларуска-літоўскім эканамічным форуме і Рэспубліканскай універсальнай выставе-кірмашы «Еўрарэгіён «Нёман» —2016».

Капейка беражэ бюджэт

Кожны год раённы бюджэт удакладняецца ў бок павелічэння. «Мы адзін з некалькіх раёнаў Гродзенскай вобласці, хто выканаў летась бюджэт без усялякіх карэкціровак», — дадае

члены Савета па ўзаемадзеянні падчас візітаў на прадпрыемствы:

— Савет па ўзаемадзеянні аб'ядноўвае прадстаўнікоў усіх катэгорый кіравання і гаспадарчых суб'ектаў — таму, па-першае, ёсць наконт чаго абмяняцца думкамі, па-другое, калі прафесіяналы сустракаюцца, яны ўзаемна ўзбагачаюць адзін аднаго. Тут таксама прымаюць удзел прадстаўнікі прафсаюзаў, Акадэміі кіравання... Я думаю, што і для гэтых арганізацый наша мерапрыемства будзе добрай школай. У Лідскім раёне досыць паспяхова вырашаюцца сацыяльныя пытанні, таму сёння мы разглядалі работу і дзіцячых дашкольных устаноў, і аб'ектаў аховы здароўя, і школ ... Можа, не так глыбока, як вытворчую сферу і работу Саветаў, але гэтыя пытанні таксама былі ў полі зроку. Такім чынам, можна казаць пра комплексны падыход. Ёсць чаму вучыцца, што запазычыць і трансфармаваць на ўсю тэрыторыю.

Вырашаць разам

Вынікі ўбачанага ў раёне прадстаўнікі Савета па ўзаемадзеянні абмеркавалі на пасяджэнні. Старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні, намеснік старшыні Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Аляксандр Папкоў адзначыў, што «гэта тое кола зносін, калі мы можам высветліць пэўныя пытанні, праблемы, якія ўзнікаюць у нашым паўсядзённым жыцці».

На пасяджэнні выступілі і прадстаўнікі кіраўніцтва Лідскага раёна і Гродзенскай вобласці. Старшыня Гродзенскага абласнога Савета дэпутатаў, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Ігар Жук адзначыў, што ў вобласці стала добрай практыкай сумесна планаваць і праводзіць розныя мерапрыемствы — прэзідыумы абласнога Савета і выканкама, пасяджэнні прэзідыума, пастаянных і міжведамасных камісій, якія створаны пры абласным выканаўчым камітэце. «Старшыня Гродзенскага аблвыканкама часта ўдзельнічае ў сесіях, кантактуе з дэпутатамі, — і мы тут цесна супрацоўнічаем. Сумесна распрацоўваем і зацвярджаем дакументы, якія ўплываюць на сацыяльна-эканамічнае жыццё. Каля 30% дэпутатаў абласнога Савета ўключаны ў склад міжведамасных камітэтаў і камісій». Дарэчы, пры абласным Савеце ў 2015 годзе быў створаны маладзёжны парламент.

Гродзенская вобласць як прыгранічная актыўна ўдзельнічае ў трансгранічных праграмах супрацоўніцтва. Дзве найбуйнейшыя: Латвія—Літва—Беларусь і Польшча—Беларусь—Украіна. Старшыня Гродзенскага аблвыканкама Уладзімір Краўцоў расказаў, што «цяпер падрыхтаваны 200 праектаў па гэтых дзвюх праграмах на суму больш за 50 млн еўра. З 2017 года пачнём працаваць над імі». Вядома, першапачаткова яны пройдуць пэўны адбор, і толькі лепшыя ідэі будуць рэалізаваны. Старшыня Лідскага райвыканкама Міхаіл Карповіч звярнуў увагу на тое, што летась дзякуючы экспарту тавараў у раён паступіла каля $270 млн — на душу насельніцтва прыпадае каля $2000 экспартнай выручкі. А гэта другое месца ў вобласці.

Ведаць адзін аднаго

Нацыянальная акадэмія навук правяла сацыялагічнае даследаванне і высветліла, ці ведаюць выбаршчыкі сваіх дэпутатаў. Лічбы не радуюць. На пярвічным узроўні сваіх дэпутатаў ведаюць 53% грамадзян, на ўзроўні раёна — 41%, вобласці — 20%, членаў Палаты прадстаўнікоў — 15%, Савета Рэспублікі — 12%. Міхаіл Мясніковіч параіў «сустракацца з людзьмі, вырашаць пытанні, а лепш не дапускаць ніякіх праблем, працаваць на апярэджанне».

Адно з галоўных дасягненняў Лідчыны, якое адзначылі ўсе ўдзельнікі выязнога пасяджэння, — прыцягненне інвестыцый. Наконт гэтага выказаўся і старшыня Савета Рэспублікі: «Давайце паглядзім на міжнародныя трэнды. Ужо другі год запар ідзе вялікі адток капіталу з краін Паўднёва-Усходняй Азіі. Па розных ацэнках, ад $500 млрд у год вяртаецца ў краіны ЕС і ЗША. Працэс набірае абароты. Толькі за 11 дзён студзеня 2017 года фонды, якія інвестуюць у Кітай, страцілі $650 млн. Адток сродкаў фіксуюць і індыйскія фонды. У той жа час, нягледзячы на санкцыі, аб'ём замежных інвестыцый у расійскія фонды склаў па другім паўгоддзі 2016-га каля $200 млн у тыдзень. А колькі замежных інвестыцый прыйшло ў Беларусь? За 9 месяцаў мінулага года — каля $1 млрд. Ці можна ў гэтай сітуацыі, калі ў нас крэдытныя рэсурсы вельмі дарагія, калі бюджэтных сродкаў і прыбытку прадпрыемстваў недастаткова, забяспечыць прыстойную мадэрнізацыю для таго, каб наша прадукцыя была канкурэнтаздольнай? Вядома, не. Таму мы вельмі зацікаўленыя ў прыцягненні прамых замежных інвестыцый.

Вядома, лепш, калі айчыннага капіталу будзе больш, але трэба зыходзіць з жорсткага прагматызму, што гэта прадпрыемства працуе на нашай тэрыторыі, з'яўляецца рэзідэнтам Рэспублікі Беларусь, плаціць падаткі ў бюджэт, там працуюць нашы людзі. На беларуска-польскім прадпрыемстве («Бел-Пласт Інтэрнэшнл». — **Аўт**.) за 17 гадоў польскі заснавальнік ні аднаго долара яшчэ адсюль не вывеў. Усе дывідэнды ён рэінвестуе ў развіццё вытворчасці. Таму трэба досыць сур'ёзна гэтым займацца і ствараць умовы для інвестараў».

Пасля наведвання пяці прадпрыемстваў настрой удзельнікаў быў узняты.

КАМЕНТАРЫЙ У ТЭМУ

ГОСЦІ НА ЛІДЧЫНЕ

Удзельнікі выязнога пасяджэння падзяліліся сваімі ўражаннямі

Старшыня Пастаяннай камісіі па дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і рэгламенце Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Леанід ЦУПРЫК:

— Закон аб мясцовым кіраванні і самакіраванні не статычны. За перыяд пасля яго прыняцця ў 2010 годзе ўжо адбылося каля сямі змяненняў і дапаўненняў, якія якраз і дазваляюць яму ў большай ступені адпавядаць патрабаванням рэальнага жыцця. Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў, працуючы ў акругах, звязаныя з тымі падзеямі, якія адбываюцца на ўзроўні сельскіх, пасялковых, абласных Саветаў. Таму тыя праблемы, якія сёння выказваюць і самі людзі, улічваюцца ў далейшай рабоце камісій парламента. Мы вельмі цэнім тую актыўнасць, якую праяўляюць нашы выбаршчыкі, і фактычна пасля кожнага прыёму грамадзян, пасля сустрэч з працоўнымі калектывамі заўсёды уносяцца прапановы ў змяненні тых ці іншых законаў.

Пасля наведвання прадпрыемстваў я магу адзначыць, што чым больш эфектыўна працуе эканоміка тэрыторыі, тым у большай ступені ідзе напаўненне бюджэту. А гэта дае магчымасці вырашаць сацыяльныя праблемы людзей. У ходзе семінара мы наведваем цэлы шэраг эканамічна паспяховых прадпрыемстваў, якія развіваюцца, што самае галоўнае, і дапамагаюць развіццю сацыяльнай сферы тэрыторыі, і ў гэтым удзельнічаюць мясцовыя Саветы. Ствараюцца неабходныя ўмовы для інвестара — гэта вельмі станоўча.

Член Савета Федэрацыі Федэральнага сходу Расіі, першы намеснік старшыні Камітэта па федэратыўным ладзе, дзяржаўным будаўніцтве, мясцовым самакіраванні і справах Поўначы Сцяпан КІРЫЧУК:

— Такое ўзаемадзеянне выканаўчых і прадстаўнічых органаў прыйшлося мне даспадобы. Усе тыя аб'екты, якія мы наведалі, маюць сваю адметнасць, але агульнае ў іх — гэта тое, што вытворчасці тэхналагічныя, новыя, сучасныя. Гэта ўплывае на будучыню Лідскага раёна. Мне спадабалася густанаселенасць раёна. Незалежна ад таго, што шмат снегу, усё пачышчана. Гэта вельмі выдатна. Уражвае вытворчасць, больш за ўсё — перспектыва аграпрамысловага комплексу па вырабе мяса індычкі. Падабаецца, што тыя прадпрыемствы, на якіх мы былі, маюць досыць вялікі працэнт экспарту. Прычым некаторыя лічаць, што іх паказчык нізкі, але не кожнае прадпрыемства можа пахваліцца такім узроўнем, а калектывы ставяць перад сабой яшчэ больш высокія задачы. Падабаецца, як Міхаіл Уладзіміравіч Мясніковіч і яго калегі ставяць пытанне аб павышэнні заработнай платы, аб выкананні даручэння Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь пра тое, каб яна была павышана да пэўнага часу.

Няма ў Беларусі тых месцаў і людзей, якія б мне не падабаліся. Гэта мая любоў, мая маладосць, і я сюды вяртаюся з велізарным пачуццём падзякі.

Намеснік старшыні Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, член Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Аляксандр МІКША:

— Прадпрыемствы, якія мы наведалі, у асноўным прыватныя, і, паколькі яны нядаўна ўтварыліся, у іх няма першасных прафсаюзных арганізацый. Таму наша задача сёння, каб на ўсіх гэтых прадпрыемствах былі прафсаюзныя арганізацыі. Такое даручэнне зрабіў на VI з'ездзе Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі лідар нашай дзяржавы Аляксандр Лукашэнка. Мы зробім усё магчымае, каб такія «пярвічкі» былі. Вопыт падказвае: калі ёсць прафсаюзная арганізацыя, нармальныя адносіны паміж ёй і кіраўніком прадпрыемства, то прадукцыйнасць працы толькі павялічваецца.

ВЫНІКІ ГОДА

ШМАТ НЕ БЫВАЕ

начальнік інспекцыі Міністэрства па падатках і зборах па Лідскім раёне Віктар СЫЧЭЎНІК. Больш як палова грошай у бюджэт паступае ад прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці і індывідуальных прадпрымальнікаў. У раёне працуюць каля 4 тысяч ІП.

Лідзія ТАНАНУШКА, начальнік фінансавага аддзела Лідскага райвыканкама, расказала пра пілотны праект, які фінансуецца з мінулага года. Ён аб'яднаў 16 гарадскіх школ, адзін ліцэй, дзве гімназіі і восем сельскіх школ. Ідэя ў тым, каб разлічваць заработную плату і ўмацаванне матэрыяльна-тэхнічнай базы не па штатным раскладзе, а згодна з колькасцю вучняў. У цэлым на сацыяльную сферу летась было выдзелена 74% расходаў. Дадатковыя грошы былі накіраваны на ахову здароўя. У цэнтральнай раённай бальніцы адрамантавалі малую аперацыйную і набылі машыну хуткай дапамогі.

Як праводзіць сесію?

Актыўна ідзе работа і са старшынямі сельскіх Саветаў. «Мы іх збіраем досыць часта, — гаворыць Інэса Белуш. — Перыядычна ў нас праходзіць вучоба. Каб павысіць якасць і ўзровень правядзення сесій і выканкамаў, арганізоўвалі іх паказальныя пасяджэнні. Рабілі іх і выязнымі. Напрыклад, у Дзітвянскім сельсавете абмяркоўвалі, як выконваецца Указ аб зносе незаселеных дамоў. У Дварышчанскім — разглядалі пытанне выканання сацыяльных стандартаў. У нас абавязкова на сесіях выканкамаў пярвічнага ўзроўню прысутнічае хтосьці з адказных работнікаў раёна, каб дэпутаты, члены сельвыканкамаў маглі задаць пытанне, якое хвалюе, усебакова разгледзець праблему і прыняць канкрэтнае рашэнне».

Не ўкладзеш — не атрымаеш

Прыём грамадзян працуе адладжана. Летась шмат зваротаў было звязана з закрыццём смеццеправодаў. «У нас гэты загад выкананы на сто працэнтаў — закрылі ўсе, але пераконваць і тлумачыць, дзеля чаго гэта зроблена, даводзілася. Яшчэ ў горадзе ў сектары індывідуальнай жылой забудовы патрэбна належным чынам зрабіць дарогі. Трэба новую гарадскую звалку ўладкаваць, пашырыць могілкі з улікам пажаданняў людзей. Па аграпрамысловым комплексе былі звароты супрацоўнікаў, звязаныя з выплатамі зарплаты і дзіцячай дапамогі. У нас ёсць свой футбольны клуб. І нашы балельшчыкі чакаюць ад гульцоў лепшых вынікаў. Знізілася колькасць зваротаў па рабоце транспарту, спажывецкім рынку і сацыяльных пытаннях».

Адзін з кірункаў дзейнасці — работа з аграгарадкамі. Іх у раёне 16.

— У нас, калі пачалася праграма адраджэння вёскі ў 2005 годзе, было 15 цэнтраў гаспадарак. Першы аграгарадок зрабілі ў Мажэйкаве. Прэзідэнцкая праграма своечасова падтрымала вёску. Калі б тады не звярнулі ўвагу, не накіравалі сродкі, там нічога не было б. Дзяржава гарантавала сельскаму жыхару ўвесь набор сацыяльных стандартаў. Іншая справа, што не спрагназавалі развіццё на 15—20 гадоў. Сёння ў нас ёсць тры аграгарадкі, дзе няма школ. Для вёскі школа — гэта будучыня. А калі дзецям трэба ехаць у суседнюю вёску вучыцца, то не факт, што яны вернуцца назад. Ды і маладыя спецыялісты, сем'і з дзецьмі хутчэй абяруць іншае месца жыхарства.

Матэрыялы падрыхтавала Надзея АНІСОВІЧ. *anisovich@zviazda.by*

ТРЭБА ПРОСТА ЛЮБІЦЬ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Між тым Наталля Аляксандраўна спачатку не планавала, што будзе браць у прыёмную сям'ю зусім маленькае дзіця. Увогуле, яны з мужам Мікалаем Іванавічам дамовіліся, што возьмуць да сябе на выхаванне адно ці двух дарослых дзяцей. Вырашылі так праз пэўны час пасля таго, як пахавалі сына, расказвае мама-выхавальніца:

— Нам казалі, што Ваня, які нарадзіўся хворым, пражыве не больш, чым год. А ў нас ён пражыў 17 з паловай гадоў. Калі сына не стала, я не ведала, куды сябе дзець. Прывыкла, што мне трэба клапаціцца пра дзіця. У нас дачка дарослая, у яе свая сям'я, двое ўнукаў падрастаюць... Зімой я мела падпрацоўку, летам дачай займалася. А вось са студзеня па красавік — хоць стукай галавой аб сцяну. Думкі пра дзяцей у мяне былі даўно. А потым неяк селі вячэраць з мужам, і я кажу: «Коля, а што калі нам узяць на выхаванне адно ці двух дзяцей?» Ён нават не раздумваў, адразу ж кажа: «А давай!» Я стала тэлефанаваць, даведвацца, як гэта робіцца. І ўсё закруцілася. Мы прайшлі камісію. Да псіхолага на вучобу ездзіла доўга. Гэта вельмі патрэбна — я там многа зразумела і даведалася. Спачатку мы не думалі аб дзіцячым доме сямейнага тыпу, а потым нам патэлефанавалі з райвыканкама і прапанавалі такі варыянт. Зноў жа раіліся са сваякамі. Гэта ж такая адказнасць! Добра, што самыя блізкія нас падтрымалі. Мы з мужам урэшце далі станоўчы адказ. Ведаеце, былі і тыя, хто нам казаў: «Вам што, не хапіла 17 гадоў, патрачаных на хворага сына?» А ў мяне, відаць, засталося шмат нерэалізаваных пачуццяў, каб дапамагаць іншым дзецям. Гэта — быццам прысвячэнне майму сыну.

Вось такая гісторыя. Ні Наталля Аляксандраўна, ні яе муж не маюць спецыяльнай педагагічнай адукацыі. Дарэчы, Мікалай Агафонаў былы дэсантнік, служыў у Афганістане. Сёння працуе брыгадзірам вытворчага комплексу буйной рагатай жывёлы ў адным з сельскагаспадарчых прадпрыемстваў. Самае галоўнае, яны вельмі любяць дзяцей і гатовы ўдасканальвацца самі, каб ім дапамагаць. Дачка і ўнукі таксама паспелі пасябраваць з новымі членамі вялікага калектыву. Прыёмная маці кажа, што ёй пастаянна дапамагаюць і спецыялісты аддзела адукацыі Веткаўскага райвыканкама.

— Восенню, пасля таго, як мы прынялі рашэнне, пазнаёміліся з гэтымі дзецьмі. Удзельнічалі з імі ў розных мерапрыемствах, у тым ліку іх дні нараджэння разам адзначалі. Яны ж самі практычна адразу пачалі мяне клікаць мамай.

Усе юныя жыхары новага дома — з праблемных сем'яў, у кожнага за кволымі плячыма сумны жыццёвы вопыт.

> “ У мяне, відаць, засталося шмат нерэалізаваных пачуццяў, каб дапамагаць іншым дзецям.

Маці Лізы пазбавілі правоў, калі дзяўчынцы было сем гадоў. Потым яна была пад апекай у сваякоў, але і тыя з выхаваннем не справіліся. Цяпер ёй 15 гадоў, узрост складаны. Але ж, кажа Наталля Аляксандраўна, пакрыху знаходзяць паразуменне. Хоць вучыць прыходзіцца нават элементарнаму. Напрыклад, як посуд мыць, як вады менш расходваць, як выкарыстоўваць сродкі для мыцця. Як выбраць рэжым для прання ў машынцы, колькі насыпаць парашку... У Андрэя гэта трэцяя прыёмная сям'я. Хлопчык імкнецца дапамагаць новым бацькам.

— У мяне пытаецца, у чым дапамагчы. Посуд памые, потым у мужа пацікавіцца, ці дапамагчы. Анечка — дзяўчынка ласкавая, але ж з хітрыкамі. Яе маці пазбаўлена правоў. Пакуль быццам не п'е, але ў яе няма жылля. То з адным жыве, то з другім. Кірылу пяць з паловай гадоў. Ён камунікабельны, лёгкі ў зносінах, не сквапны — усіх цукеркамі з падарункаў надзяліў. Некаторым іншым прыходзіцца растлумачваць, што ў сям'і трэба дзяліцца. У многіх раней рацыён быў такі абмежаваны, што дзеці не разумеюць, як можна проста так есці рыбу, катлеты або салату, — кажа Наталля Аляксандраўна. — Спачатку мы баялася, як дзеці нас успрымуць. Цяпер адчуваем, што малыя нам пачалі давяраць, дзяліцца сваімі сакрэтамі. Яны прынялі нас усёй душой, і гэта галоўнае.

Між тым сям'я будзе папаўняцца. Дом вялікі, амаль 200 метраў квадратных, добра абсталяваны ўсім неабходным, разлічаны на 10 дзяцей, і праз некаторы час так і будзе. Пакуль што ўсе разам рыхтуюцца ўрачыста адзначыць дзень нараджэння самага малодшага:

Сям'я Дамасканавых з Чачэрска.

— Арсенію хутка споўніцца тры гады. Мы для яго зробім свята. Ужо дамовіліся, што купім яму падарунак, торт, свечкі, будзем песні спяваць і фатаграфавацца.

Намеснік начальніка аддзела адукацыі, спорту і турызму Веткаўскага райвыканкама Таццяна ПОМАЗАВА гаворыць, што спецыялісты пастаянна кантралююць сем'і, дзеці ў якіх знаходзяцца ў небяспечным становішчы:

— На працягу апошніх гадоў колькасць такіх сем'яў застаецца практычна нязменнай. На ўлік стаіць 53 сям'і, і 130 дзяцей маюць патрэбу ў дапамозе. У нас ёсць прыёмныя, апякунскія сем'і, і цяпер вось два дамы сямейнага тыпу. Сітуацыя ў праблемных сем'ях своечасова адсочваецца, мы абавязкова наведваем іх. Ёсць сем'і, з якіх зняты статус сацыяльна-небяспечных, але яны ўсё роўна пад кантролем. Нават у тым выпадку, калі дзяцей вярнулі.

Між тым падчас адкрыцця другога дзіцячага дома сямейнага тыпу — у Чачэрску **старшыня Гомельскага аблвыканкама Уладзімір ДВОРНІК** нагадаў, што дарослым неабходна зрабіць усё для таго, каб дзеці, пакінутыя без апекі бацькоў, не адчувалі сябе чужымі ў гэтым свеце:

— У вобласці больш як 80% дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, пражываюць у сем'ях — гэта адзін з найлепшых паказчыкаў у рэспубліцы. Комплекс мер, рэалізаваных дзяржавай апошнім часам, дазволіў значна палепшыць становішча такіх малых. Будучыня дзяржавы залежыць ад таго, хто прыйдзе на змену цяперашняму пакаленню. Таму вельмі важна, каб кожнае дзіця, пазбаўленае бацькоўскай увагі, атрымала магчымасць жыць і выхоўвацца ў доме, дзе ёсць сямейнае цяпло.

Гэта зусім не проста, але ж сужэнцы Марына і Мікалай Дамасканавы, якія заўсёды хацелі мець вялікую сям'ю, нарэшце сталі прыёмнымі бацькамі шасцярых дзяцей і спадзяюцца, што ў іх усё атрымаецца. У Чачэрскім доме сямейнага тыпу зазвінелі галасы чатырох хлопчыкаў і дзвюх дзяўчынак. Самаму малодшаму пяць гадоў, самаму старэйшаму — 16.

Дзіцячы дом сямейнага тыпу ў Чачэрску, як і Веткаўскі, пабудаваны за кошт сродкаў рэспубліканскага і абласнога бюджэтаў. На яго выдаткавана больш за 300 тысяч рублёў. Як вядзецца, на ўлазінах было шмат падарункаў. Вялікай сям'і губернатар уручыў сертыфікаты на набыццё мяккай мэблі і тэлевізара, а Дзед Мароз паклаў пад ялінку цацкі і гульні.

Ірына АСТАШКЕВІЧ. *iost@zviazda.by*

АХОВА ПАРАДКУ

УНІВЕРСАЛЬНЫ МІЛІЦЫЯНЕР,

або Увесь РАУС у асобе ўчастковага

Прыкладна кожнае пятае злачынства раскрываюць участковыя інспектары міліцыі. Ці хапае ўчастковых у сельскай мясцовасці? А самім участковым, напрыклад, службовых аўто? Як часта здараюцца падчас службы «нестандартныя сітуацыі»?
Гэта высвятляў карэспандэнт «МС».

Ведаюць усё пра ўсіх

У Віцебскай вобласці больш за 400 участковых. Як адзначылі ва УУС, праблем з кадрамі няма. «Некамплект», як кажуць, рабочы: не больш за 10%.

— Нам ёсць з каго выбіраць — я пра кандыдатаў ва ўчастковыя. Галоўнае не колькасць, а якасць... Па сутнасці, участковы — начальнік міліцыі з усімі адпаведнымі функцыямі і паўнамоцтвамі. Як правіла, першы выязджае па месцы правапарушэння або ў складзе аператыўна-следчай групы, займаецца прафілактыкай злачынстваў, іх раскрыццём і г. д. Практыка паказвае, што там, дзе ўчасковы старанны, ён напрацоўвае вопыт, карыстаецца аўтарытэтам і павагай мясцовых жыхароў, — кажа **начальнік УУС Віцебскага аблвыканкама, генерал-маёр міліцыі Віктар СЯНЬКО.**

Яскравы прыклад такога «ўніверсальнага міліцыянера» — прадстаўнік Віцебскага РАУС. Два разы, у 2015 і 2016 гадах, старшы ўчастковы інспектар, маёр міліцыі Сяргей Ціханаў перамагаў у рэспубліканскім аглядзе-конкурсе.

Начальства Сяргея Валер'евіча адзначае, што сакрэт поспеху супрацоўніка — яго зацікаўленасць і мэтанакіраванасць. Сам ён прызнаўся, што ў дзяцінстве марыў стаць менавіта міліцыянерам. Абслугоўвае тэрыторыю, на якой знаходзіцца і яго родны пасёлак Акцябрскі. У міліцыі служыць каля 10 гадоў. Да гэтага пасля віцебскай ВНУ працаваў на прадпрыемстве лёгкай прамысловасці ў абласным цэнтры, потым — галоўным інжынерам у сельскагаспадарчай арганізацыі.

Асаблівасць яго ўчастка ў тым, што недалёка горад. Ды і ў дачны сезон колькасць людзей значна павялічваецца. У «звязцы» з калегам участковы пачаў адпрацоўваць тэрыторыю сельсавета, якая падзелена на два ўчасткі. Эфектыўнае ноу-хау падхапілі іншыя...

Важная роля прафілактыкі

Кіраўнік УУС адзначае работу ўчастковых па прафілактыцы правапарушэнняў.

— Летась на 3,9% знізілася колькасць злачынстваў па лініі ўсіх нашых службаў, а ў крымінальным вышуку — на 5,2%. На бытавой падставе стала менш забойстваў і цяжкіх цялесных пашкоджанняў. Зніжана колькасць злачынстваў, учыненых у грамадскіх месцах, у стане алкагольнага ап'янення, непаўналетнімі і пры іх саўдзеле, раней судзімымі...

Шмат у чым гэтаму спрыяла эфектыўная дзейнасць участковых інспектараў міліцыі. У прыватнасці, па накіраванні хранічных алкаголікаў у ЛПП, абмежаванні ў дзеяздольнасці, вынясенні ахоўных прадпісанняў у дачыненні да сямейных дэбашыраў і гэтак далей.

Таксама ўчастковыя раскрылі 4 цяжкія злачынствы. Сярод іх два забойствы, цяжкае цялеснае пашкоджанне, якое пацягнула смерць, разбойны напад.

Тое, што ўчастковыя могуць быць і ратавальнікамі, даказаў Віктар Зелянеўскі з Лепельскага РАУС. Ён праявіў рашучасць падчас выратавання рыбака, які тануў вясной на возеры. Схапіў прасла плота, прапоўз да палонкі — каля дзесяці метраў ад берага... Капітана міліцыі Віктара Зелянеўскага ўзнагародзілі Ганаровай граматай абласнога Таварыства выратавання на водах.

Дапамога ад мясцовай улады

У свой час мы пісалі аб праблеме недахопу службовага транспарту для ўчастковых. Ці змянілася сітуацыя?

За ўчастковымі Віцебшчыны сёння замацаваны 102 аўтамашыны: 22 — у гарадской і 80 — у сельскай мясцовасці. Зразумела, «колы» дазваляюць больш эфектыўна сачыць за парадкам. Тым больш, што на многіх участках вёскі знаходзяцца на вялікай адлегласці. А міліцыянерам трэба наведаць састарэлых, каб растлумачыць ім, напрыклад, як не трапіць у пастку махляроў, і іншае...

У Віцебскім аблвыканкаме разумеюць важнасць службы участковых. Губернатар з разуменнем успрыняў адпаведны зварот кіраўніцтва УУС. Паабяцаў падтрымку. Тым больш, што ёсць нагода — сёлета міліцыя краіны святкуе 100-гадовы юбілей.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.
pukshanski@zviazda.by

«ЗАДАЧА ДЭПУТАТА — АРГАНІЗАВАЦЬ».

Так лічыць старшыня Магілёўскага гарсавета Сяргей ІВАНОЎ

Гэты год для магілёўскіх дэпутатаў асаблівы. Менавіта на яго прыпадаюць дзве знамянальныя даты — 750-годдзе Магілёва і 100-годдзе з дня стварэння гарадскога Савета дэпутатаў. Народныя абраннікі абяцаюць напоўніць будучую рэчаіснасць годнымі справамі. А сёння ёсць нагода прыгадаць, чым запомніўся мінулы год, які таксама быў багаты на падзеі. Увод у строй Пушкінскага моста, рэканструкцыя Мінскай шашы, актыўны ўдзел у форуме Магілёўскай і Бранскай абласцей у Магілёве і шмат чаго іншага. Ніводная значная падзея ў горадзе не абыходзілася без дэпутатаў гарсавета. Але былі ў іх рабоце і будзённыя моманты, якіх хапае ў кожнага, каму прыходзіцца займацца грамадскай справай. У размове са старшынёй гарсавета Сяргеем ІВАНОВЫМ мы зрабілі акцэнт менавіта на гэта. І пачалі, вядома ж, з самага балючага пытання — скаргаў.

Некаторыя думаюць, што дэпутатам плацяць

У руках старшыні стос афіцыйных папер — рэгістрацыйна-кантрольныя карткі, куды ўпісваюцца даныя, а потым і накладаецца рэзалюцыя — каму і ў які тэрмін выканаць. Непасрэдна да старшыні гарсавета падчас прамых ліній і асабістых прыёмаў на працягу года паступіла 211 зваротаў.

— Гэта крыху болей, чым раней, але і ў нас стала больш формаў і метадаў вырашэння праблем. Да таго ж раней не існавала суботніх «прамых ліній». Ні адзін зварот — ні пісьмовы, ні вусны — не застаецца без разгляду. Ёсць, праўда, пытанні доўгатэрміновыя. Вось патэлефанаваў нам грамадзянін, які жыве на апошнім паверсе, паскардзіўся, што пасля дажджоў залівае яго кватэру. Правялі абследаванне — сапраўды цячэ. Наогул рамонт даху — гэта планавыя работы, якія патрабуюць вялікіх фінансавых укладанняў. Але, калі сітуацыя аварыйная, робіцца рамонт толькі ў месцы пашкоджання. Мы адсочваем гэты працэс, пакуль ён не завершыцца. Або вось пішуць: паміж вуліцамі Кедравай і Курака нездавальняючы стан дарогі. Асабіста выязджаў, сустракаўся з заяўнікамі, кантраляваў. Атрымаў цэлых пяць справаздач ад дарожна-маставога прадпрыемства. Калі былі адпіскі, я гэта падкрэсліваў і адпраўляў зноў — прасіў прыняць меры. Нарэшце работы па прафіліроўцы праезнай часткі вуліцы Кедравай з выкарыстаннем новага матэрыялу былі выкананы і пытанне знята з кантролю. Але людзі не заўсёды разумеюць, у чым заключаецца наша работа. Калі пытанне доўга не вырашаецца або вырашаецца не так, як таго хацелася б некаторым, сыплюцца папрокі: «І за што вам толькі грошы плацяць?» Прыходзіцца тлумачыць, што з усяго дэпутацкага корпуса, а ў нас 37 дэпутатаў, толькі старшыня працуе на платнай аснове, астатнія на грамадскіх пачатках. Ніякіх грошай, ільгот і прэферэнцый яны за сваю дзейнасць не атрымліваюць.

Каб прадпрыемства не дакацілася да банкруцтва

— Ёсць у нас такая форма дзейнасці, як работа дэпутацкіх маніторынгавых груп, — кажа Сяргей Іваноў. — У іх уваходзяць старшыня гарсавета, намеснікі старшыні гарвыканкама, адказ-

Кожны зварот на кантролі.

ныя за прамысловую сферу, кіраўнікі ўпраўленняў і службаў гарвыканкама і найбольш аўтарытэтныя дэпутаты з вялікім досведам гаспадарчай дзейнасці. Сумесна з упраўленнем эканомікі гарвыканкама вызначаем найбольш праблемныя ў плане эканомікі прадпрыемствы і наведваем іх. Цікавімся, якія вынікі гаспадарчай дзейнасці, ці выплачваюцца падаткі, заробак і гэтак далей. Асноўная мэта маніторынгавай групы — не пакараць, а сумесна з кіраўніцтвам прадпрыемства зрабіць грунтоўны аналіз, разабрацца, у чым прычыны невыканання планавых заданняў, нізкай рэнтабельнасці, стратнасці. Усе выезды афармляюцца пратаколамі: хто выязджаў, якія пытанні вырашылі. На «Вяснянцы», напрыклад, даручылі дырэктару падрыхтаваць і прадставіць ва ўпраўленне эканомікі гарвыканкама пакрокавы план мерапрыемстваў па загрузцы вытворчых магутнасцяў па кожным структурным падраздзяленні прадпрыемства. На «Строммашыне» — гэта прадпрыемства, якое знаходзіцца на кантролі Прэзідэнта — таксама праблем яшчэ хапае, але сур'ёзныя зрухі да паляпшэння ўжо ёсць. У прыватнасці, паступілі заказы на вытворчасць аснасткі для здабычы калійных угнаенняў. Выязджалі на «Магілёўдрэў», там таксама нядрэнныя перспектывы пасля змены кіраўніцтва. Наведвалі вагонабудаўнічы завод, Казіміраўскі эксперыментальны завод, «Магатэкс». Апошняе прадпрыемства працуе не дрэнна, але 2015 год скончыла з адмоўным фінансавым вынікам. Зараз там знайшлі шляхі выхаду і працуюць стабільна.

Яны ж не нашы «клоны»

У кастрычніку ў Магілёве выбралі маладзёжны парламент другога склікання. Кандыдаты, выбарчая камісія на чале са старшынёй гарсавета дэпутатаў, выбаршчыкі — усё было, як таго патрабуе выбарчае заканадаўства. Удзельнічала 75 устаноў адукацыі, было вылучана 219 кандыдатаў, выбрана 70 членаў маладзёжнага парламента. Яшчэ 5 уключаны пасродкам кааптацыі — дадатковага папаўнення складу выбарнага органа новымі членамі без звароту да выбаршчыкаў.

— Дэпутаты першага склікання ад моладзі былі першапраходцамі, у іх вочы гарэлі. Мы дапамагалі ім, але не навязвалі нейкія ідэі і ўстаноўкі. Заарганізаваць можна любое добрае пачынанне. Абмяжоўваліся падказкамі, парадамі, але моладзь у асноўным сама вызначала кірункі дзейнасці. Яны не нашы «клоны», у іх больш самастойнасці, іх нельга заганяць у нейкія рамкі. Паўнамоцтвы маладзёжнага парламенту зводзяцца да магчымасці неяк праявіць сябе. Па сутнасці, гэта дапамагае сфарміраваць пачуццё адказнасці за сваю радзіму, месца, дзе ты жывеш. Вось, напрыклад, моладзь жадае, каб было больш забаўляльных цэнтраў. Але, калі дэпутат маладзёжнага парламента паслухае, якія праблемы ёсць у горадзе у галіне адукацыі, медыцыны, будаўніцтва і гэтак далей, ён па-іншаму будзе расстаўляць прыярытэты.

Галоўнае прызначэнне старшага па доме

Штогод дэпутаты падводзяць вынікі на лепшы двор і пад'езд. Сёлета дыпломы пераможцаў і грашовыя прэміі атрымаюць старшыя па дамах Ларыса Агірчук і Тамара Валькоўская, якія сумеснымі намаганнямі зрабілі ўзорнай дваровую тэрыторыю дамоў №5 па бульвары Непакораных і дома №44 па вуліцы Гагарына. Другое месца ў Алены Асмалоўскай, старшай па пад'ездзе №3 дома 18а па вуліцы Прафсаюзнай, і трэцяе — у Таццяны Міланавай, старшай па пад'ездзе №1 дома 52 па праспекце Шміта.

> Людзі не заўсёды разумеюць, у чым заключаецца наша работа. Калі пытанне доўга не вырашаецца або вырашаецца не так, як таго хацелася б некаторым, сыплюцца папрокі: «І за што вам толькі грошы плацяць?»

— Як бы добра нашы камунальнікі ні працавалі, зрабіць усё ўзорна практычна немагчыма, — кажа Сяргей Іваноў. — Тут вялікі ўпор робім на саветы мікразон і органы мясцовага самакіравання — дамавыя і вулічныя камітэты, старшых па дамах, пад'ездах. Камісія аб'язджае ўсе адрасы і вызначаецца з лепшым вулічкамам, мікразонай, дамавым камітэтам і гэтак далей. Прызначэнне людзей, якія ўваходзяць у органы грамадскага самакіравання, мы бачым у тым, каб яны на сваёй тэрыторыі рашалі вось гэтыя мясцовыя праблемы. Галоўнае — арганізаваць народ. Але бывае, што старшыня вулічкама або дамкама бачыць галоўнае прызначэнне ў тым, каб прыйсці ў адміністрацыю, ЖЭУ, гарвыканкам і на павышаных танах патрабаваць рашыць якую-небудзь праблему. Але гэта не ёсць рашэнне праблемы. Фінансавыя магчымасці горада не бязмежныя, а ў існуючых умовах — наогул мізэрныя. Для таго, каб камусьці даць, у кагосьці трэба забраць. І тут шмат што залежыць ад нашых актывістаў. Што яны могуць зрабіць разам са сваімі жыхарамі? І ёсць людзі, якія добра гэта робяць. У нас кожны дэпутат уваходзіць у савет мікразоны, а 4 нават узначальваюць іх. У склад мікразоны ўключаны таксама начальнік тэрытарыяльнага ЖЭУ або яго намеснік. Калі працуе такая звязка, вельмі шмат чаго можна зрабіць з прыцягненнем сродкаў прадпрыемстваў, арганізацый, прадпрымальнікаў, якія дзейнічаюць на гэтай тэрыторыі. Вось дэпутаты Ігар Шапнеўскі і Віктар Нікіцін зрабілі такім чынам дзіцячае збудаванне ў раёне дома №39 па Пушкінскім праспекце. Яно невялікае, але ёмістае і ўтульнае. Галоўнае было знайсці грошы, арганізаваць працэс. І такія прыклады не адзінкавыя.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

Мультымедыйны кантэнт — пасажырам магістралі

Беларуская чыгунка прапаноўвае пасажырам новую паслугу — доступ у паяздах да мультымедыйнага кантэнту.

Ён будзе арганізаваны ў цягніках міжрэгіянальных ліній бізнес-класа, якія курсіруюць па маршруце Мінск—Гомель—Мінск, расказалі ў прэс-цэнтры магістралі. Рэалізацыя новага праекта, адзінага ў цяперашні час у транспартным комплексе Беларусі, стала магчымай дзякуючы мантажу ў цягніках праграмна-апаратнага комплексу — медыясервера. Яго работа пабудавана на базе тэхналогіі Wi-Fi, якая дазваляе пасажырам чыгункі з выкарыстаннем асабістых смартфонаў, ноўтбукаў атрымліваць задавальненне ад прагляду мэдыякантэнту. Прычым устаноўка дадатковага праграмнага забеспячэння на гаджэтах не патрабуецца.

Інфармацыя, прадстаўленая на медыясерверы, вельмі разнастайная. Яна ўключае мастацкія фільмы розных жанраў, дакументальныя фільмы, серыялы, музычныя кліпы і трэкі, аўдыя- і электронныя кнігі.

Да свят беларуская магістраль прадугледзела для пасажыраў спецыяльны святочны рэпертуар мультымедыйнага кантэнту.

Таксама ў найбліжэйшай будучыні на медыясерверы будуць размешчаны актуальная відэаінфармацыя аб паслугах, якія аказваюцца Беларускай чыгункай, правілах бяспечнага знаходжання на аб'ектах чыгуначнага транспарту, а таксама прэзентацыйныя відэаролікі магістралі.

Сяргей РАСОЛЬКА.
rs@zviazda.by

У Магілёве з'явіліся скульптуры багоў Гермеса і Вялеса

Магілёўскае прадпрыемства «Магілёўаўтадар» вырашыла зрабіць свой унёсак ва ўпрыгожванне горада. Скульптуры вышынёй больш чым два метры з'явіліся ў нішах прыгожага будынка з калонамі на вуліцы Першамайскай, дзе знаходзіцца адміністрацыя прадпрыемства.

— Магілёўшчына знаходзіцца на скрыжаванні шляхоў, звязваючы рускія, украінскія, польскія і беларускія землі, — патлумачыў гэтую ідэю **намеснік генеральнага дырэктара РУП «Магілёўаўтадар» Сяргей ТЫЛЕЦ.** — Яна была і на шляху «з варагаў у грэкі», яе неаднаразова перасякалі расійскія і замежныя імператары і імператрыцы. Вось мы і вырашылі ўшанаваць заступнікаў дарог, якімі былі грэчаскі Гермес і славянскі Вялес. Гэта была задумка нашага былога кіраўніка Аляксандра Мініна і доктара архітэктуры, прафесара кафедры «Горадабудаўніцтва» БНТУ Армена Сардарава. А ўвасобілі яе ў жыццё магілёўскі скульптар Андрэй Вараб'ёў і яго мінскія калегі.

Дарэчы, менавіта дзякуючы магілёўскім дарогабудаўцам міжнародныя трасы М-4 (Мінск—Магілёў) і М-5 (Мінск—Гомель) рэканструяваны пад першую катэгорыю. І нават зараз, у зімовы час, працягваецца будаўніцтва стратэгічна важнага аб'екта — моста цераз раку Сож у раёне Слаўгарада. Ён звяжа гэты райцэнтр з Краснаполлем і дасць магчымасць Слаўгараду стаць бліжэй да мяжы з Расіяй.

Нэлі ЗІГУЛЯ.
zigulya@zviazda.by

Сама парушыла закон

У Вілейцы па факце злоўжывання службовымі паўнамоцтвамі ўзбудзілі крымінальную справу супраць судовага выканаўцы па ч. 2 арт. 424 Крымінальнага кодэкса Беларусі. Ёй пагражае да шасці гадоў пазбаўлення волі.

Пра гэта паведаміла **старшы памочнік пракурора Мінскай вобласці Ларыса ПАРХІМОВІЧ.** Такое ў гісторыі правасуддзя здарылася ўпершыню. Службовая асоба, якая павінна стаяць на варце закона, сама яго парушыла: замест таго, каб спагнаць з двух даўжнікоў 800 рублёў, закрыла судовыя вытворчасці.

— У выніку праверкі, якая праводзілася па даручэнні абласной пракуратуры, высветлілася, што жанчына ў чэрвені мінулага года склала афіцыйныя дакументы, якія ўтрымлівалі заведама лжывыя звесткі, нібыта ў даўжнікоў адсутнічае маёмасць, — растлумачыла Ларыса Пархімовіч. — Пасля гэтага прыняла рашэнне аб заканчэнні судовых вытворчасцяў і вяртанні выканаўчых дакументаў у суд. На самай справе яна павінна была арыштаваць маёмасць грамадзян, якія цяпер адбываюць пакаранне і павінны аплаціць пацярпелым прычыненыя страты.

Па словах Ларысы Пархімовіч, сваімі дзеяннямі судовы выканаўца нанесла істотную шкоду правам і законным інтарэсам грамадзян, дзяржавы, падарвала прэстыж і аўтарытэт органаў дзяржаўнай улады.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.
lazovskaya@zviazda.by

ТЭРЫТОРЫЯ Ў ПАРАДКУ

Сельская ідылія на новы лад

У справе добраўпарадкавання вёсак акцэнт робіцца на месцы грамадскага адпачынку

Што ні кажыце, а ці не самым галоўным клопатам сельскага Савета з'яўляецца знешні выгляд населеных пунктаў і сельскіх тэрыторый і ўсё, што з ім звязана. Адсюль і вялікі кавалак работы, накіраванай на знос альбо прывядзенне ў парадак дамоў, што застаюцца без гаспадароў. А яшчэ дзясяткі спраў па паляпшэнні знешняга выгляду вуліц населеных пунктаў, добраўпарадкаванні могілак ды іншае. Грошай на гэта бюджэт сёння можа выдаткаваць не надта многа. Таму кіраўнікам мясцовай улады даводзіцца круціцца: будзіць грамадскую ініцыятыву, шукаць спонсараў, вывучаць чужы вопыт, каб запазычыць ідэі сабе на карысць.

Старшыні-суседзі Валянціна БЯЗНОСІК і Мікалай БАСАЛАЙ.

Суседскія семінары

Старшыня Івацэвіцкага раённага Савета дэпутатаў Аляксандр САРОКА расказаў, што кіраўніцтва райсавета, старшыні сельскіх выканкамаў збіраюцца фактычна штомесяц, каб параіцца па пытаннях добраўпарадкавання. Апошнім часам сталі часцей выязджаць на месцы. І на гэтыя семінары цяпер запрашаюць старастаў. Падобны абмен вопытам прыносіць свае вынікі. Вяскоўцы сталі пераймаць адзін у аднаго станоўчыя напрацоўкі. «Так заўсёды ў жыцці было — разважае Аляксандр Фёдаравіч. — Калі мая жонка заўважыць нейкую цікавінку на падворку нашых сяброў-суседзяў, то альбо сама стараецца набыць, калі гаворка ідзе пра дэкаратыўны гаршчок з кветкамі, альбо мне ўкажа, калі патрабуецца прыкласці гаспадарскія рукі. Так і старасты робяць пасля семінараў. Скажам, заўважыў вясковы лідар з Яглевіч нешта цікавае ў Стайках, глядзіш — і ў першай з названых вёсак праз тыдзень-другі з'явілася падобная клумба альбо дзіцячая пясочніца».

Вось такія суседскія семінары, калі за дзень наведвалі два сельсаветы, пайшлі на карысць рабоце па добраўпарадкаванні могілак. Яшчэ некалькі гадоў таму была вялікая праблема — ачысціць могілкі ад старых вялікіх дрэў і кустоўя. Цяпер гэта работа ў раёне падыходзіць да завяршэння. Большая яе частка праведзена за кошт сродкаў, якія сабралі жыхары вёскі і нашчадкі тых, хто знайшоў тут спачын і чые магілы трэба ўтрымліваць у парадку. Вясковыя могілкі, якія вызвалены ад лішняй расліннасці, бытавых адходаў і абгароджаны, перадаюцца на баланс ЖКГ. Далей ужо камунальнікі клапоцяцца пра вываз смецця, абкошванне травы па перыметры, іншыя бягучыя пытанні добраўпарадкавання.

На што яшчэ звярнуў увагу старшыня райсавета — гэта на традыцыю ўсталявання сквераў, дзіцячых пляцовак, адным словам — месцаў культурнага адпачынку вяскоўцаў. Раней лічылася так: каб было куды пайсці сельскаму працаўніку пасля работы, павінен функцыянаваць клуб. Але многае змянілася ў жыцці вёскі. Цяпер насельніцтва вёсак, асабліва летам, складаецца з вялікай часткі гараджан. Дзеці і ўнукі прыязджаюць на канікулы і ў адпачынак. У аграгарадках, там, дзе ўзводзіцца жыллё, пражывае нямала маладых сямей з дзецьмі. У сучаснага чалавека стала больш вольнага часу. І мамы з каляскамі цяпер выглядаюць звычайным атрыбутам сельскіх вуліц. А куды ім пайсці? Вось і паўстала пытанне аб невялікіх парках, скверах — абавязкова з дзіцячымі пляцоўкамі ў цэнтры вёскі.

Аляксандр Фёдаравіч расказаў пра сваё ўяўленне сельскай ідыліі. Гэта калі на дзіцячай пляцоўцы мамачка прысела адпачыць на прыгожай лаўцы, большы з яе дзяцей займаецца на дзіцячым турніку, сярэдні будуе ў пясочніцы «замкі», а маленькі дрэмле ў калясцы. І калі пры гэтым наша ўмоўная шматдзетная маці адпачывае не з півам альбо цыгарэтамі, а, скажам, праглядае ў смартфоне навіны, то гэта ідэал, да якога трэба імкнуцца, — пагадзілася я са сваім суразмоўцам.

Сквер рабілі талакой

Стайкі — адна з вёсак, дзе нядаўна з'явіўся такі аб'ект з адмысловай дзіцячай пляцоўкай. **Старшыня Стайкаўскага сельскага Савета Мікалай БАСАЛАЙ** найперш запрашае ў новы сквер, які цяпер стаў прадметам гонару ўсіх вяскоўцаў. Справа ў тым, што да нядаўняга часу гэтая тэрыторыя, зусім не на ўскраіне, нагадвала закінутую пустку. Зарослы кустоўем непрывабны куток быў цікавы хіба аматарам выпіць далей ад чужых вачэй.

Таму пачыналі з суботнікаў. Спачатку спатрэбілася расчысціць тэрыторыю ад лішняй расліннасці, пакідалі толькі сталыя ўстойлівыя дрэвы. З тэхнікай дапамагло мясцовае сельгаспрадпрыемства. Астатняе зрабілі рукі і грамадская ініцыятыва.

І вось тут мы маем прыклад, як амаль без сродкаў можна разам зрабіць добрую справу талакой. Расчыстка сквера стала першай задачай, з якой жыхары Стаек справіліся. А вось ператварыць яго ў пляцоўку для адпачынку можна было, хоць бы паставіўшы лаўкі. Яны ж, як вядома, каштуюць грошай. Тады дамовіліся з суседнім лясніцтвам. Леснікі адпусцілі бярвенні ў парадку спонсарскай дапамогі. З круглых дзеравін шляхам распілоўкі на дзве часткі атрымалі лаўкі, у нечым нават эксклюзіўныя.

Варта сказаць, што галоўным завадатарам добраўпарадкавання сквера стаў старэйшы вёскі Анатоль Трафімчык. Ён знаходзіў умельцаў, якія аздобілі пляцоўку сваімі рукамі на грамадскіх пачатках. Так побач з лаўкамі паявіліся драўляныя жырафы і нават скульптуркі казачных дзеда з бабай. Некаторым прыстасаванням для сядзення з дапамогай сякеры прыдалі выгляд самалётаў на радасць дзятве. Далей расфарбавалі старыя бочкі і шыны, з якіх зрабілі новыя кампазіцыі, спатрэбіліся і розныя закручастыя дрэвы, якія знаходзілі ў лесе. Адным словам, тыя, хто прыклаў рукі да агульнакарыснага праекта, падышлі да справы з фантазіяй, творча. Сельвыканкам паклапаціўся пра пясочніцы на новай пляцоўцы. Праўда, у той дзень, калі наш карэспандэнт завітала ў Стайкі, пайшоў снег і прыкрыў усю самадзейную прыгажосць, але ж зусім няцяжка ўявіць, як прыемна і дзецям, і дарослым адпачываць тут з ранняй вясны да восені.

Сквер з дзіцячай пляцоўкай у Стайках.

Дзіцячы гарадок у Яглевічах.

— Усё лета вяскоўцы з задавальненнем сюды прыходзілі — расказвае Мікалай Басалай. Праўда, не абышлося без маленькіх прыкрасцяў. Аднойчы, ранкам тут знайшлі пустыя пляшкі, упакоўкі ад немудрагелістай закускі ды надпісы, выразаныя нажом на лаўцы. Участковы адразу ўзняў пытанне аб устаноўцы камеры відэаназірання. Але адкуль у сельскага Савета грошы на такую апаратуру? Пакуль сышліся на актывізацыі работы добраахвотных дружыннікаў.

Ад праваслаўнага прыхода

Старшыня Стайкаўскага сельскага Савета Мікалай Басалай на сваёй пасадзе працуе не вельмі даўно. А вось **яго суседка Валянціна БЯЗНОСІК** узначальвае Яглевіцкі сельвыканкам працяглы час. Пра калегу Мікалай Іванавіч адзываецца з удзячнасцю, бо дапамагала па першым часе ўвайсці ў курс справы, дзялілася напрацоўкамі, у тым ліку і па пытаннях добраўпарадкавання. А вось цяпер старшыні-суседзі абменьваюцца вопытам як у рабочым парадку, так і падчас выязных семінараў, пра якія гаварыў старшыня раённага Савета.

У Яглевічах цэнтр вёскі паступова вымалёўваецца вакол храма, узведзенага ў 2008 годзе. Царкву пабудавалі ўзамен старой драўлянай, якая прастаяла сто гадоў, але моцна пацярпела ад пажару. Менавіта сельскі святар протаіерэй Віталь Кот арганізаваў прыхаджан на добрую агульнакарысную справу.

Літаральна за вясну — пачатак лета сёлета побач з царквой вырас дзіцячы гарадок, які абрысамі нагадвае старажытную крэпасць. Пасля заняткаў дзеці з задавальненнем бягуць сюды са школы, якая знаходзіцца побач. Збоку ад казачнай крэпасці зроблена не проста кармушка, а цэлая сталоўка для птушак. Дзеці іх падкормліваюць, а заадно вучацца стасункам з жывой прыродай. Паводдаль добра прыкметныя абрысы сквера, які прывялі ў парадак, далей падрастае малады сад. Усё гэта робіцца стараннямі актывістаў прыхода і яго святара, вядома, пры падтрымцы мясцовай улады.

Святлана ЯСКЕВІЧ.
yackevich@zviazda.by
Івацэвіцкі раён.

Дзяржава для народа
Мясцовае Самакіраванне
Газета выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

Адказны за выпуск: КАРПЕНКА Н.У.
Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, намеснік старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ:
220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН 292 44 12;
e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.008. **Нумар падпісаны ў 19.30 24 студзеня 2017 года.**

■ Тэорыя і практыка

НЕЙРАХІРУРГІЯ ЗАЎТРАШНЯГА ДНЯ

Пералік паказанняў да аперацый на галаўным мозгу ў дзяцей значна павялічыўся за апошнія некалькі гадоў

У краіне цягам года выконваецца звыш 500 нейрахірургічных аперацый у дзяцей (больш за 100 з іх звязана з пухлінамі цэнтральнай нервовай сістэмы, каля 250 — з гідрацэфаліяй). Усяго чатыры гады таму іх было на цэлую сотню менш. А што было гадоў дзесяць таму, мы добра памятаем: прапанаваць цяжкахворым дапамогу падобнага ўзроўню і з адпаведным эфектам хірургія проста не магла. З таго часу сусветная, а следам і айчынная нейрахірургія неверагодна змяніліся.

Фота Надзеі БУЖАН.

У першую чаргу трэба гаварыць не столькі аб поўным вылячэнні, колькі аб паляпшэнні якасці жыцця хворых і іх сем'яў. Дагэтуль дзецям з эпілепсіяй, напрыклад, маглі прапанаваць у якасці лячэння толькі таблеткі. Некаторым гэтага дастаткова, прыступы становяцца радзейшымі, але ёсць і такія, каму ніякая хіміятэрапія не дапамагае дабіцца палёгкі. Цяпер гэтыя пацыенты — кандыдаты на аперацыю. За два апошнія гады прааперыраваны ўжо каля трыццаці дзяцей ва ўзросце да 18. За некаторым выключэннем гэта былі фактычна трыццаць унікальных аперацый — захворванне хоць і адно, але ж аддзелы мозга пашкоджваюцца розныя. Пасля выдалення хворых участкаў і правядзення супрацьсутаргавай падтрымліваючай тэрапіі прыступы ва ўсіх сталі радзейшымі, у некаторых выпадках зніклі наогул.

— Такія магчымасці не з'яўляюцца раптоўна, ім папярэднічаюць гады вучобы, лекцый і стажыровак у замежных клініках, — расказвае **галоўны пазаштатны дзіцячы нейрахірург Міністэрства аховы здароўя Рэспублікі Беларусь, загадчык нейрахірургічнага аддзялення №3 Рэспубліканскага навукова-практычнага цэнтра неданошаным аперацыю могуць правесці ў неанатальных аддзяленнях РНПЦ «Маці і дзіця», 2-га раздзільнага дома Мінска, абласных клініках.**

«Неўралогія і нейрахірургія», кандыдат медыцынскіх навук Міхаіл ТАЛАБАЕЎ, абраны, дарэчы, нядаўна прэзідэнтам Еўразійскай асацыяцыі дзіцячых нейрахірургаў, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі Азербайджана, Арменіі, Беларусі, Грузіі, Казахстана, Малдовы, Украіны, Узбекістана і Расіі. — Па ўзроўню тэхнічнай базы і якасці падрыхтоўкі спецыялістаў наша краіна на постсавецкай прасторы займае адно з найпершых месцаў. Цяпер у межах нашай асацыяцыі мы будзем працягваць супрацоўніцтва з Міжнародным і Еўрапейскім таварыствамі дзіцячых нейрахірургаў, чаго раней ніколі не было. Гэтыя арганізацыі штогод праводзяць па шэсць навучальных школ у розных краінах свету, і адна з іх будзе сёлета праведзена ў Беларусі.

Анкалогія ў дзяцей развіваецца, як вядома, па сваіх законах. Пухліны галаўнога мозга могуць быць вялікіх памераў, але дзіця пры гэтым ні на што не скардзіцца, па-ранейшаму актыўнае.

Што такое падобныя школы для нашай краіны, зразумець вельмі лёгка. Гэта тое, з дапамогай чаго можна без прамаруджвання акацца ў будучыні. Падчас лекцый прапануецца глыбокі аналіз новых аператыўных умяшанняў, праведзеных у свеце з рознымі вынікамі. Каб самастойна прааналізаваць кожны з іх, спатрэбяцца гады. А тут — каштоўная інфармацыя на талерачцы ды яшчэ магчымасць асабістых кантактаў са свяціламі. Усё ж такі захворванні для ўсіх кантынентаў агульныя, хоць і адрозненні ёсць. Некаторыя паталогіі ў Кітаі ці Японіі сустракаюцца часта, а для Еўропы не характэрныя — казуістыка! І тым не менш Міхаіл Талабаеў вывучае іх ды робіць аперацыі.

Так было з адной з самых складаных аперацый у нейрахірургіі — функцыянальнай гемісфератаміяй. Проста адрэзаць усё пашкоджанае паўшар'е, вядома, нерэальна — выдаляецца толькі верхні слой. Тэхнічна гіперскладана, але вынік у такога лячэння добры. Выконваюць аперацыю далёка не ў кожным нейрахірургічным цэнтры Еўропы, а Талабаеў узяўся за яе асваенне. Спачатку запрашаў калег з Расіі, назіраў, вучыўся, а летась узяў і зрабіў.

— Нейрахірургія не зможа развівацца належным чынам, калі не будзе працаваць у звязцы са спецыялістамі, якія выяўляюць і накіроўваюць да нас пацыентаў — з тымі ж неўролагамі і анколагамі, — дадае Міхаіл Уладзіміравіч. — Урачы-дыягносты павінны ведаць пра нашы магчымасці і своечасова прапаноўваць пацыентам хірургічнае лячэнне. Гэта ў першую чаргу важна пры выяўленні анкалагічных захворванняў. Сёння з 1-й і 2-й стадыямі раку мозга 5-гадовую выжывальнасць маюць звыш 90 працэнтаў дзяцей, на позніх стадыях — каля 70. Яшчэ пятнаццаць гадоў таму мы маглі толькі марыць пра такія вынікі, бо фактычна ўсе пацыенты траплялі ў поле зроку ўрача ў запушчаным стане. Цяпер жа сталі даступнымі камп'ютарная і магнітна-рэзанансная тамаграфія, што дазваляе выяўляць пухліны як мага раней...

Анкалогія ў дзяцей развіваецца, як вядома, па сваіх законах. Пухліны галаўнога мозга могуць быць вялікіх памераў, але дзіця пры гэтым ні на што не скардзіцца, па-ранейшаму актыўнае. Гэта прымушае бацькоў думаць, што ўсё ў парадку, аперацыя не патрэбная. Праблема? Яшчэ якая...

Аперыруюцца нейрахірургамі ўжо нават немаўляты вагой 1 кг, калі ў іх пацвярджаюцца паказанні да такога метаду лячэння. Глыбока праведзеных аперацый таксама можа праявіцца не адразу пасля таго, як пацыент расплюшчыць вочы. Трэба набрацца цярпення — і самім спецыялістам, і бацькам, і маленькім пацыентам.

Святлана БАРЫСЕНКА.
protas@zviazda.by

■ Дзіцячы свет

ПАЧЫНАЕЦЦА З СЯМ'І

Псіхолагі даследавалі групу 6—7-гадовых дзяцей, каб высветліць, ці ёсць адрозненне ў фарміраванні вобразу свету ў тых, хто пражывае ў поўнай і няпоўнай сем'ях.

Паводле слоў **дацэнта кафедры псіхалогіі адукацыі Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя М. Танка, кандыдата псіхалагічных навук Святланы ПАКРОЎСКАЙ**, вобраз сям'і — самы важны кампанент карціны свету дзяцей. Ад таго, наколькі яна стала значнай для дзіцяці, наколькі прымаецца ім, можа залежаць яго актыўнасць пры стварэнні ў будучым сям'і ўласнай. Гарманічныя стасункі ў сям'і ад пачатку фарміруюць гарманічную асобу, аднак сустракаецца гэта нячаста, і тут лепей звярнуць увагу не на знешнія абставіны існавання сям'і ў прынцыпе, а на стасункі ў ёй. Уплыў бацькоў на фарміраванне светапогляду ў дзяцей вельмі вялікі. У малых заўсёды шмат пытанняў, і яны ідуць па адказы ў першую чаргу да бацькоў. Нейкі час дзіця наогул карыстаецца толькі светапоглядам бацькоў.

Дзецям з няпоўных сем'яў для паўнацэннага псіхічнага развіцця сапраўды не хапае своечасовай эмацыянальнай падтрымкі, разумення дарослымі таго, як фарміруецца іх характар. Яны шукаюць прызнання ў сям'і або сярод равеснікаў і натуральнага выражэння пачуццяў. Бо ў некаторых могуць быць вельмі слаба развітыя здольнасці ўстанаўліваць кантакты, працягла іх падтрымліваць, ім не стае гібкасці, натуральнасці ў стасунках, умення прымаць і іграць ролі.

«Склад сям'і — не першачарговы складальнік псіхічнага здароўя дзіцяці. Больш важны псіхалагічны клімат у доме, эмацыянальны стан членаў сям'і, іх стаўленне адзін да аднаго, узаемная падтрымка. Лепей спакойнае жыццё ў няпоўнай сям'і, чым напружанне і канфлікты там, дзе ёсць абодва бацькі», — адзначае спецыяліст.

Святлана БАРЫСЕНКА. *protas@zviazda.by*

СВЕДЕНИЯ О РЕЗУЛЬТАТЕ ПРОВЕДЕНИЯ РЕКЛАМНОЙ ИГРЫ

«ДЕЛИСЬ НОВОГОДНИМ НАСТРОЕНИЕМ!»

Наименование Рекламной игры: «Делись новогодним настроением!» (далее – Рекламная игра)

Организатор Рекламной игры: Производственное унитарное предприятие «Кока-Кола Бевриджиз Белоруссия» (зарегистрированное 17 марта 2014 г. в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за №100373962; УНП 100373962).

Местонахождение Организатора Рекламной игры: 223056, Республика Беларусь, Минский район, д. Колядичи, 147/2.

Сроки проведения Рекламной игры:
Начало: 16 ноября 2016 г.
Окончание: 27 января 2017 г.
Рекламная игра «Делись новогодним настроением!» зарегистрирована в Министерстве антимонопольного регулирования и торговли Республики Беларусь, свидетельство о государственной регистрации №2854 от 24 октября 2016 г.

Территория проведения Рекламной игры – Республика Беларусь.
Призовой фонд рекламной игры был разыгран не в полном объеме. Неразыгранные призы остаются в распоряжении Организатора Рекламной игры.
В рекламной игре приняли участие 29 699 (двадцать девять тысяч шестьсот девяносто девять) человек.
Результаты проведения рекламной игры «Делись новогодним настроением!» с указанием полного списка победителей приведены на сайте www.zviazda.by.
По вопросам проведения Рекламной игры обращайтесь по телефону **(017) 2-100-100** с 9:00 до 17:30 в рабочие дни с 16 ноября 2016 г. по 27 января 2017 г.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА

Могилевский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» сообщает о проведении торгов в виде открытого аукциона по продаже Базы отдыха в Чечевичах, принадлежащей ОАО «ММЗ»

Лот №1 «База отдыха в Чечевичах» в составе: **капитальное строение с инв. №702/С-811 –** баня базы отдыха; **капитальное строение с инв. №702/С-806** – дом базы отдыха; **капитальное строение с инв. №702/С-814** – здание топочной базы отдыха (в составе: котельная и навес для дров); **капитальное строение с инв. №702/С-813** – кухня базы отдыха; **капитальное строение с инв. №702/С-812** – склад на базе отдыха; **капитальное строение с инв. №702/С-809** – спальный корпус на базе отдыха (в составе: спальный корпус с подвалом; дорога (асфальтовое покрытие), мост, подпорная стенка базы отдыха, ограждение на базе отдыха в Чечевичах; артезианская скважина базы отдыха); **капитальное строение с инв. №702/С-808** – спальный корпус-4 базы отдыха (в составе: спальный корпус-4 с мезонином, цокольным этажом и мини-кафе; беседка 1П6392 с инв. № по бух. уч. 063; беседка 1П6392 с инв. № по бух. уч.. 062; беседка 1П6392 с инв.№ по бух. уч. 065; беседка 1П6392 с инв. № по бух. уч. 064); **капитальное строение с инв. №702/С-816** – туалет в Чечевичах; **капитальное строение с инв. №702/С-817** – уборная на базе отдыха; **капитальное строение с инв. №702/С-815** – электроподстанция с в/вольтными сетями на базе отдыха; **водогрейный котел 1,2*1,2*0,6** (инв. № по бух. уч. 41417); **котел отопительный КС-Т-25 -Э1** (инв. № по бух. уч. 41400); **котел отопительный МИР-95** в комплекте (инв. № по бух. уч. 41418); **лесопарковая зона №3** (инв. № по бух. уч. 1227); **лесопарковая зона №5** (инв. № по бух. уч. 1233); **лесопарковая зона №6** (инв. №1234); **лесопарковая зона №7** (инв. № по бух. уч. 1235); **лесопарковая зона №1** (инв. № по бух. уч. 1223); **лесопарковая зона №2** (инв. № по бух. уч. 1225); **лесопарковая зона №4** (инв. № по бух. уч. 1231); **можжевельник обыкновенный №2** (инв. № по бух. уч. 1224); **можжевельник обыкновенный №4** (инв. № по бух. уч. 1228); **преобразователь частоты F1500P0040t3P** (инв. № по бух. уч. 122889); **распределительное устройство** (инв. № по бух. уч. 41125); **стойка ресепшен СТР-1967** (инв. по бух. уч. № 0998); **трансформатор силовой** (инв. № по бух. уч. 41147); **туя западная №3** (инв. № по бух. уч. 1226); **туя западная №5** (инв. № по бух. уч. 1232); Навес на б/о Чечевичи (инв. № по бух. уч. 02409); **наружный водопровод** (инв. № по бух. уч. 0277); **площадка для базы отдыха** (инв. № по бух. уч. 02415); **площадка парковки автомобилей на Б/О Чечевичи** (инв. № по бух. уч. 02404); **сети канализации** (инв. № по бух. уч. 0278); **теплотрасса к зданию топочной** (инв. № по бух. уч. 0331).

Сведения о земельном участке: земельный участок с кадастровым номером 721385600001000016 (право постоянного пользования), площадью 4, 8718 га, расположенный по адресу: Могилевская область, Быховский район, Черноборский с/с, 0,6 км севернее д. Чечевичи, назначение – земельный участок для обслуживания базы отдыха.

Начальная цена продажи: 746 940,00 белорусских рублей. Сумма задатка 15 000,00 бел. руб.

Продавец	ОАО «ММЗ» УНП 700123720, г. Могилев, ул. Курако, 28
Расчетный счет для перечисления задатка	Получатель платежа – РУП «Институт недвижимости и оценки», УНП 190055182, р/с 3012154337010 в ОАО «БПС-Сбербанк», ЦБУ №703 г. Минск, МФО 153001369
Дата, время и место проведения аукциона	**Аукцион проводится 28 февраля 2017 года в 14.00** по адресу: г. Могилев, ул. Первомайская, 99, офис Могилевского филиала РУП «Институт недвижимости и оценки». Последний день подачи заявок и внесения задатка: 27 февраля 2017 года до 15.00
Срок и условия оплаты приобретенного с аукциона имущества	В течение 15 рабочих дней со дня подписания протокола аукциона с победителем заключается договор купли-продажи. Оплата производится в течение 20 рабочих дней со дня подписания договора купли-продажи

Для участия в аукционе приглашаются граждане, юр. лица и индивидуальные предприниматели Республики Беларусь, иностранные инвесторы, подавшие заявление на участие в аукционе (по форме, установленной Организатором аукциона); предоставившие заверенную банком копию платежного поручения о внесении задатка, заявление об ознакомлении с документами, продаваемым Объектом (по форме, установленной Организатором аукциона) и заключившие с Организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона (по форме, установленной Организатором аукциона), а также прилагаются следующие документы: – юридические лица Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации, копии учредительных документов, копию документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; – индивидуальные предприниматели Республики Беларусь – копию свидетельства о гос. регистрации и документа, подтверждающего постановку на учет в налоговом органе; – физ. лица – паспорт, представители физ. лиц и индивидуальных предпринимателей – паспорт и доверенность, удостоверенную нотариально; – иностранные юридические лица – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны учреждения (выписка должна быть произведена не ранее шести месяцев до подачи заявления на участие в торгах) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны учреждения с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; – иностранные индивидуальные предприниматели – легализованный в установленном порядке документ, подтверждающий статус, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык; – представители иностранного юридического лица, иностранного физического лица или индивидуального предпринимателя – доверенность, легализованную в установленном законодательством порядке, с нотариально засвидетельствованным переводом на белорусский или русский язык.

Победитель аукциона – участник, предложивший наибольшую цену. Условие – наличие не менее 2 участников. Единственный участник имеет право приобрести объект по начальной цене, увеличенной на 5%.

Участник, выигравший торги, возмещает затраты на организацию и проведение аукциона в соответствии со счет-фактурой, которые подлежат уплате в течение 3 рабочих дней после проведения аукциона.

Дополнительную информацию можно получить по тел.: (8-0222) 32-43-98, (8-0291) 400-394; 8-029-624-26-25

Управляющий по банкротству НП ОДО «Фундаменты» (дело №442-1Б/2016 от 16.05.2016, экономический суд г. Минска) УНП 101210206, г. Минск, ул. Каменногорская, 47-69, 70, в лице директора ООО «БизнесУэй» Вергейчик А.П., сообщает о проведении собрания кредиторов по защите требований ГП «УКС Центрального района г. Минска. Собрание по защите требований состоится 16 февраля 2017 г. в 17 часов 00 минут по адресу: г. Минск, ул. К. Либкнехта, д. 45, оф. 40. Ознакомиться с предъявленными требованиями и выдвинутыми возражениями заинтересованным лицам можно в рабочее время по адресу управляющего.

Проводятся первые публичные торги имущества банкрота – ИП Баранчика Д.С.

Предмет торгов: **автомобиль «FORD-FOCUS», VIN №WF0BXXGCDB2T33442, 2002 г. в., цвет красный**
Начальная цена предмета торгов: **3609,00 руб**.
Шаг торгов: **180,45 руб.**
Сумма задатка: **360,90 руб**.
Местонахождение: г. Минск, ул. Володько, 9А

Публичные торги в электронной форме в процедуре экономической несостоятельности (банкротства) (далее – торги) будут проведены на электронной торговой площадке **WWW.BELLOT.BY**: начало – **27 февраля 2017 г.**, в 09 часов 00 минут, окончание – **27 февраля 2017 г.**, в 12 часов 00 минут.
Организатор торгов: **ИП Милашевский А.А.**, 220065, г. Минск, а/я 77; (8029) 6531666.
Продавец: **ИП Баранчик Д.С. в лице антикризисного управляющего ООО «БизнесУэй».**

Ознакомиться с лотом можно в будние дни с 09.00 до 17.00 по месту нахождения лота, предварительно согласовав время прибытия.

Подробные условия торгов опубликованы на сайте Единого государственного реестра сведений о банкротстве **www.bankrot.gov.by** и на сайте **www.BelLot.by**.

Для участия в торгах необходимо в срок **по 25 февраля 2017 г.**
- перечислить задаток по лоту на расчетный счет 3013 0590 73008 в ЗАО «БСБ Банк» отделение №1 г. Минск, пл. Свободы, 4, код 175, УНП 690770327, получатель – ИП Баранчик Д.С., назначение – задаток для участия в торгах;
- далее подать заявку по лоту на участие в торгах на сайте **WWW.BELLOT.BY;**
- направить в отсканированном виде все прилагаемые к заявке документы по адресу: ooo.business.way@gmail.com (подробнее – в информации лота на **WWW.BELLOT.BY)**

РУП «ИНСТИТУТ НЕДВИЖИМОСТИ И ОЦЕНКИ»

извещает о проведении повторного открытого аукциона со снижением цены по продаже имущества, принадлежащего РУП «Жилкоммунтехника» на праве хозяйственного ведения

Лот			Начальная цена с НДС, бел. руб.	Задаток, бел.руб.	Шаг аукциона, %
№1	Комплекс зданий, сооружений, передаточных устройств с оборудованием	Могилевская обл., Осиповичский р-н, г. Осиповичи, ул. Проектируемая, 14	2 155 545,49	107 777,27	5

1. Производственный корпус инв. №714/С-18710. Г.п. – 1985. Площадь – 8589,3 м². Этажей – 1.
2. Административно-бытовой инв. №714/С-18711. Г.п. – 1985. Площадь – 2786,8 м². Этажей – 4.
3. Гараж инв. №714/С-18712. Площадь – 424 м². Этажей – 1.
4. Гараж инв. №714/С-18713. Площадь – 320 м². Этажей – 1.
5. Склад инв.№714/С-28799.Площадь – 43,4 м². Этажей – 1.
6. Котельная с инв. №714/С-28800. Площадь – 33,7 м². Этажей – 1.
7. Канализация производственная инв. №714/С-28792. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 61,6 м. Кол-во составных элементов – 6, колодцев – 7.
8. Дождевая канализация инв. №714/С-28790. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 677,5 м. Кол-во составных элементов – 3, колодцев – 32.
9. Противопожарный водопровод инв. №714/С-28798. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 650,9 м. Кол-во составных элементов – 5, линий – 1, колодцев – 4.
10. Сети электроснабжения 0,4 кВт инв. №714/С-28788. Вид сети – кабельная. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 925,5 м. Кол-во составных элементов – 3.
11. Внеплощадочные сети телефонные инв. №714/С-28789. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 324,7 м. Кол-во составных элементов – 1, колодцев – 5.
12. Канализация производственно-бытовая инв. №714/С-28791. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 253,5 м. Кол-во составных элементов – 1, колодцев – 14.
13. Внеплощадочные сети дождевой канализации инв. №714/С-28793. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 303,9 м. Кол-во составных элементов – 1, колодцев – 9.
14. Внеплощадочные сети производственно-бытовой канализации инв. №714/С-28794. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 215,65 м. Кол-во составных элементов – 1, колодцев – 7.
15. Водопровод хозяйственно-питьевой с инв. №714/С-28796. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 212,1 м. Кол-во составных элементов – 4, колодцев – 2.
16. Внеплощадочные сети водопровода с инв. №714/С-28797. Дата ввода в эксплуатацию – декабрь 1985 г. Протяженность – 279,8 м. Кол-во составных элементов – 3, колодцев – 5.
17. Емкость 3,2 м³ с инвентарным номером 427 согласно инвентарной карточке.
18. Емкость 3,2 м³ с инвентарным номером 428 согласно инвентарной карточке.
19. Иное имущество, с перечнем которого можно ознакомиться на сайте ino.by или обратившись к Организатору аукциона

ОБРЕМЕНЕНИЯ

Производственный корпус с инв. №714/С-18710 и административно-бытовой корпус с инв. №714/С-18711 находятся в залоге. Залогодержатель, юридическое лицо, резидент Республики Беларусь, Открытое акционерное общество Белорусский банк развития и реконструкции «Белинвестбанк» дал согласие на их продажу

ЗЕМЕЛЬНЫЙ УЧАСТОК

Земельный участок площадью 4,6297 га с кадастровым номером 724850100001001442. Целевое назначение – земельный участок для размещения объектов промышленности. Право постоянного пользования. Переход права на земельный участок осуществляется в соответствии с действующим законодательством Республики Беларусь

УСЛОВИЯ

Победитель аукциона либо в случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в аукционе подано только одним участником и он согласен приобрести Объект по начальной цене, увеличенной на 5% (пять процентов), – Претендент на покупку, должен заключить с Продавцом договор купли-продажи Объекта в течение 10 (десяти) банковских дней с момента подписания протокола о результатах аукциона.

Условия оплаты приобретенного на аукционе Объекта согласовываются Победителем аукциона (Претендентом на покупку) и Продавцом при заключении договора купли-продажи, но не позднее 30 (тридцати) дней со дня проведения аукциона.

